Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 КАСТРЫЧНІКА 2012 г. СУБОТА № 199 (27314) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Пакуль што дзіцячыя дамы сямейнага тыпу не выцясняюць класічныя інтэрнаты, але з'яўляюцца для іх цудоўнай альтэрнатывай. Гэта — сям'я, дзе на поўным дзяржаўным забеспячэнні выхоўваюцца ад пяці да дзесяці сірот.** СТАР. 3



**Кінааператар Аляксей РАДЗІВОНАЎ амаль праз 30 гадоў пасля здымак «Ідзі і глядзі», паводле сцэнарыя Алеся Адамовіча наведаў Беларусь. Прафесіянал з больш чым 40-гадовым стажам расказаў «Звяздзе», чаму ў Беларусь едуць кіношнікі.** СТАР. 4



**У Беларусі зарэгістравана 60 найменняў уласных, арыгінальных фармсубстанцый. Зразумела, што большасць закупляецца за мяжой, у тым ліку самыя простыя, якія не выгадна асвойваць у нас...** СТАР. 6

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НЕ ЗАДАВОЛЕНЫ ВЫНІКАМІ РАБОТЫ КАНДЫТАРСКАЙ ГАЛІНЫ БЕЛАРУСІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка не задаволены вынікамі работы кандытарскай галіны. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на нарадзе па развіцці гэтай сферы, перадае БелТА.**

Кіраўнік дзяржавы адразу акрэсліў дзве групы пытанняў для абмеркавання ў ходзе нарады. Гэта развіццё кандытарскай галіны краіны ў цэлым і рэалізацыя адпаведнай праграмы да 2015 года, а таксама работа двух буйных прадпрыемстваў у гэтай галіне — «Камунаркі» і «Спартака».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў гэтай сферы існуе шэраг праблем. «Па-першае, тэмпы росту вытворчасці ў кандытарскай галіне значна адстаюць ад агульных тэмпаў развіцця эканомікі краіны. Прытым і «Камунарка», і «Спартак», якія забяспечваюць амаль трэць рэспубліканскага аб'ёму вытворчасці кандытарскіх вырабаў, на жаль, не паказваюць у гэтай справе прыклад, аб чым сведчыць статыстыка», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, гэта вядзе да таго, што істотна скарачаецца доля айчыннай прадукцыі на ўнутраным рынку Беларусі, які ўсё больш запаўняецца замежнымі канкурэнтамі: «Калі ў 2005 годзе доля рэалізацыі айчынных кандытарскіх вырабаў насельніцтву ў агульным аб'ёме продажаў на беларускім рынку складала звыш 90 працэнтаў, то за мінулы перыяд бягучага года — толькі крыху больш за 70 працэнтаў».

«Па-другое, за апошнія пяць гадоў у цэлым па кандытарскіх вырабах атрыманы практычна двухразовы рост адмоўнага сальда знешнегандлёвай дзейнасці (з $33,8 млн у 2005 годзе да $67 млн у 2011 годзе)», — канстатаваў беларускі лідар.

Па-трэцяе, прадоўжыў Аляксандр Лукашэнка, у галіны практычна адсутнічае ўласная сбытавая сетка на асноўных знешніх рынках, а выкарыстанне пасрэднікаў значна зніжае эфектыўнасць усёй работы.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, калі не прыняць належных мер, беларускія кандытары на фоне абвастрэння канкурэнтнай барацьбы ў АЭП, а затым і ў СГА здадуць свае пазіцыі. «Гэтага дапусціць мы не можам», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад прадстаўнікоў урада далажыць аб тым, што робіцца для вырашэння існуючых пытанняў.

Да правядзення нарады кіраўнік дзяржавы наведаў СААТ «Камунарка», азнаёміўся з вытворчымі магутнасцямі прадпрыемства, асартыментам прадукцыі. Аляксандру Лукашэнку таксама было далажана аб перспектывах развіцця СП ААТ «Спартак». Прэзідэнт актыўна цікавіўся станам спраў на прадпрыемствах і перш за ўсё тым, колькі сродкаў і з якіх крыніц было ўкладзена ў мадэрнізацыю і развіццё вытворчасцяў за апошнія гады.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць эфектыўнай работы прадпрыемстваў на ўсіх стадыях: «Вы павінны атрымліваць сыравіну па мінімальнай цане, скарачаць сабекошт прадукцыі і больш атрымліваць ад продажаў. Іншай схемы ў свеце не прыдумалі. Менавіта з гэтых пазіцый мы будзем глядзець на вашу работу».

## ПРЭЗІДЭНТ ДАРУЧЫЎ ПРАВЕРЫЦЬ ВЫКАНАННЕ РАСПАРАДЖЭННЯ АБ ЗАБАРОНЕ НА КУПЛЮ НОВЫХ ЛЕГКАВЫХ АЎТО МАЮЧЫМ ДАЎГІ ДЗЯРЖУСТАНОВАМ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду і Адміністрацыі Прэзідэнта праверыць, як выконваюцца яго даручэнні, дадзеныя 11 верасня на нарадзе з урадам па пытаннях работы эканомікі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы забараніў дзяржаўным установам і арганізацыям, якія маюць даўгі перад бюджэтам або банкамі, набываць новыя легкавыя аўтамабілі.

Аб выніках праверкі Прэзідэнту будзе дакладзена ў бліжэйшы час.

■ Рэгіён

## ФЕРМЕРЫ ПЕРАЛІЧЫЛІ 3 МІЛЬЯРДЫ РУБЛЁЎ ПАДАТКАЎ

**Паводле інфармацыі Віцебскай абласной падатковай інспекцыі, у паўночнай вобласці краіны дзейнічаюць 407 фермерскіх гаспадарак.**

Сёлета паступленні падаткаў у кансалідаваны бюджэт Віцебскай вобласці ад гэтай катэгорыі плацельшчыкаў перавысілі 3 мільярды рублёў. А ў параўнанні з мінулым годам фермерскія гаспадаркі пералічылі ў бюджэт грошай прыкладна ў 2,1 раза больш.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

---

**Жанчынам-маці Рэспублікі Беларусь**

**ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІЦЫ!**

**АД УСЁЙ ДУШЫ ВІНШУЮ ВАС З ДНЁМ МАЦІ.**

*Мама — першае і галоўнае слова ў лёсе чалавека. З глыбіні стагоддзяў дайшла да нас вялікая запаведзь: шануй бацьку свайго і маці сваю — і будзеш шчаслівы. Адзіная на свеце жанчына, дзякуючы якой мы прыходзім на гэтую Зямлю, назаўсёды застаецца для кожнага анёлам-ахоўнікам, надзейным прычалам у бурным жыццёвым моры.*

*Вялікія дружныя сем'і, дзе растуць здаровыя дзеці, — гарантыя трываласці ўстояў дзяржавы. Таму пытанні сацыяльнай абароны і падтрымкі мацярынства заўсёды будуць у цэнтры нашай увагі. Мы забяспечым найлепшыя ўмовы для таго, каб вы нараджалі як мага больш малых, выхоўвалі іх пад мірным небам, у спакойнай і шчаслівай краіне.*

*Мілыя нашы мамы! Нездарма кажуць, што дзеці — гэта самае каштоўнае ўпрыгажэнне і важны крытэрый поспеху любой жанчыны. І таму, дабіваючыся вышынь у прафесійнай і грамадскай дзейнасці, не забывайце пра сваё найпершае прызначэнне — дарыць жыццё і захоўваць цяпло дамашняга ачага. Няхай вас заўсёды акружаюць усмешлівыя твары сыноў і дачок, а побач будзе блізкі, любячы чалавек.*

*Зычу вам і вашым родным здароўя, шчасця і добрага настрою.*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

---

**Работнікам культуры Рэспублікі Беларусь**

**ДАРАГІЯ СЯБРЫ!**

**ПРЫМІЦЕ МАЕ ШЧЫРЫЯ ВІНШАВАННІ З ДНЁМ РАБОТНІКАЎ КУЛЬТУРЫ.**

*Самабытная нацыянальная культура з'яўляецца адным з краевугольных каменёў у фундаменце беларускай дзяржаўнасці, той непераадольнай сілай, якая аб'ядноўвае ўсіх нас і напаўняе сэрца любоўю да велічнай і прыгожай Айчыны.*

*За гады незалежнасці ў нашай краіне шмат зроблена для захавання гістарычнай спадчыны і ўзбагачэння сучаснай беларускай культуры, якая развіваецца як ніколі актыўна, набываючы сусветнае прызнанне. Мы ганарымся вашымі дасягненнямі і заўжды будзем падтрымліваць тых, хто сваім талентам і майстэрствам уносіць важкі ўклад у задавальненне духоўных патрэб грамадства, стварае шэдэўры, дастойныя нашага часу.*

*Жадаю, каб у гэты асаблівы для вас дзень вы атрымалі ў падарунак мора кветак і апладысментаў, а з імі — нашу павагу і прызнанне за самаадданае служэнне Радзіме.*

*Моцнага вам здароўя, натхнення, творчых поспехаў, шчасця і дабрабыту.*

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

---

Фота Валерыя КАРАЛЯ.



■ Дзень маці

# ШЧАСЛІВАЯ...

**Малодшаму Раману толькі споўнілася два гады, а на сямейным савеце вырашылі аддаць яго ў дзіцячы садок. Цяжка ўтрымліваць сям'ю з сямі чалавек на адну зарплату бацькі. Таму Аксана і вырашыла выйсці на работу. Першы месяц яна на працы пасля дэкрэтнага. Катастрафічна нічога не паспявае, хоць устае ў пяць, кладзецца спаць апоўначы. «Нічога, — смяецца, — яшчэ тыдзень-другі — і ўсё стане на свае месцы».**

Аксана Гаркалюк — усмешлівая, жыццярадасная маці сямейства. Ёй усяго 33 гады, а такая багатая — трох дачок і двух сыноў мае. Гэтым летам ёй уручылі ордэн Маці.

...Дзяўчына з палескай вёскі Плотніца прыехала некалі ў Брэст шукаць свайго шчасця. І знайшла яго. Працавала на розных прадпрыемствах, а потым пайшла на будоўлю — там плацілі найлепш. А заадно і навучылася ўсяму, што патрэбна цяпер пры ўладкаванні свайго ўласнага дома. Сустрэла добрага хлопца Валерыя Гаркалюка, стварылі сям'ю. Прадпрыемства «Брэстжылбуд», дзе яны на той час абое працавалі, выдзеліла пакой у інтэрнаце, з часам іх сям'я заняла два пакоі, бо ў інтэрнаце нарадзілася іх чацвёртае дзіця. Праўда, калі дачушка Сашка з'явілася на свет, яны і пераехалі ў новы дом. Ну а малодшы, Рома, нарадзіўся ўжо ў сваім доме. СТАР. 3

■ Рэнесанс

# ВЕЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ РАДЗІВІЛАЎ

## КАНЦЭПЦЫЯ РЭСТАЎРАЦЫІ НЯСВІЖСКАГА ПАЛАЦА АБАПІРАЛАСЯ НА ЛЕПШЫЯ ЎЗОРЫ, КАЛІ ЁН ПЕРАЖЫВАЎ НАЙВЯЛІКШЫ ЎЗДЫМ



**Хутка споўніцца тры гады, як Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» узначаліў Сяргей Клімаў. А трапіў ён сюды невыпадкова. Справа ў тым, што Міністэрства культуры Беларусі ўпершыню аб'явіла конкурс на пасаду дырэктара. Адклікнулася некалькі прэтэндэнтаў, якія выказалі сваё бачанне далейшага развіцця палацавага комплексу. Найбольш спадабалася членам конкурснага камітэта менавіта праграма Клімава.**

***— Сяргей Міхайлавіч, якія прапановы вы агучылі ў гэтым, скажам так, стратэгічным дакуменце. Што канкрэтна ўдалося зрабіць?***

— Самае галоўнае, адкрылі палац Радзівілаў. Над канцэпцыяй яго музеефікацыі разам з намі працавала некалькі вельмі моцных каманд, у рабочую групу ўваходзілі спецыялісты буйнейшых беларускіх музеяў, мастацтвазнаўцы, гісторыкі. А сёлета адкрылі экспазіцыю ў Слуцкай браме. Сабраць сродкі і купіць алтар дапамагла дыяспара нясвіжан, што пражываюць у Польшчы. Але экспазіцыя тут сезонная, працуе з красавіка па верасень, паколькі будынак пакуль не ацяпляецца. СТАР. 2

---

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі:**

*«У Беларусі аплата жыллёва-камунальных паслуг будзе залежаць ад ступені даходаў грамадзян. Мы цяпер сумесна з Мінжылкамгасам і Мінпрацы і сацабароны выпрацоўваем меры, якія далі б магчымасць без урону для грамадзян з нізкімі даходамі ўстанавіць плату за жыллёва-камунальныя паслугі, набліжаныя да сабекошту. Гэта няпростае пытанне, вырашэнне якога не ляжыць на паверхні. Таму спачатку мы плануем увесці дыферэнцыяваныя тарыфы на аплату электраэнергіі, ацяплення і выкарыстання газу для ацяплення, што датычыцца выкарыстання газу для гатавання ежы, механізм аплаты будзе пакуль ранейшым».*

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 10° |
| Віцебск | + 8° |
| Гомель | + 8° |
| Гродна | + 9° |
| Магілёў | + 8° |
| Мінск | + 9° |

### Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.10.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8500,00 | ▼ |
| Еўра | 11020,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 274,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1044,68 | ▼ |

## Беларускі рубель умацаваўся да долара

**Па выніках таргоў на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы 12 кастрычніка курс нацыянальнай валюты ўмацаваўся да долара ЗША, аслабеў да еўра, захаваўся нязменным да расійскага рубля, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

Да долара беларускі рубель сёння зафіксаваў пазіцыю Br8 500 (на папярэдніх таргах, 11 кастрычніка — Br8 550). Аб'ём праведзеных здзелак па гэтай валюце склаў $57,427 млн.

Адносна еўра беларускі рубель устанавіўся на ўзроўні Br11 020 (11 кастрычніка — Br11 000). Падагульняючы аб'ём здзелак склаў 26,287 млн. еўра.

На таргах расійскім рублём трэці дзень захоўваюцца суадносіны, якія ўсталяваліся на таргах 10 кастрычніка, Br274,5 за 1 расійскі рубель.

---

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ПОЛЬШЧА НАЗВАЛА ПАМЫЛКАЙ СТВАРЭННЕ ЕЎРА

Стварэнне адзінай еўрапейскай валюты было памылкай. Пра гэта падчас пасяджэння Міжнароднага валютнага фонду ў Токіа заявіў старшыня Цэнтральнага банка Польшчы Марэк Белка. Яго словы цытуе Bloomberg. На сайце агенцтва гэтая цытата пакуль не апублікавана. Белка дадаў, што стварэнне еўра было вынікам нестабільнасці ранейшых еўрапейскіх валют. Як адзначае польскае выданне Onet, кіраўнік польскага ЦБ таксама заявіў, што Польшча не мае намеру пераходзіць на еўра да заканчэння пазыковага крызісу. У цяперашні час, на яго думку, не выключаны поўны развал валютнага саюза. Варшава мае намер перайсці на адзіную валюту толькі ў тым выпадку, калі пачнецца аднаўленне эканомікі ў такіх краінах, як Іспанія. Раней падобны пункт гледжання выказваў міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі. У цяперашні час да еўразоны далучыліся 17 краін з 27 дзяржаў Еўрасаюза.

## КАТАЛОНІІ ЗАБАРАНІЛІ ПРАВОДЗІЦЬ РЭФЕРЭНДУМ АБ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ АД ІСПАНІІ

Парламент Іспаніі прагаласаваў супраць пастановы, якая дазваляе ўладам Каталоніі праводзіць рэферэндум аб самавызначэнні гэтага рэгіёна, паведамляе Reuters. Праект адпаведнага дакумента быў унесены на разгляд дэпутатаў рэгіянальнай каталонскай партыяй, аднак супраць яго прагаласавалі як кіруючыя кансерватары, так і апазіцыянеры з Сацыялістычнай партыі. Жыхары Каталоніі выступілі за правядзенне такога рэферэндуму ў канцы верасня, аднак з-за процідзеяння цэнтральных улад галасавання не адбылося.

Каталонія — адзін з самых паспяховых рэгіёнаў Іспаніі, які валодае ўласнай культурай, мовай і традыцыямі. Аднак з-за эканамічнай палітыкі Мадрыда ён, як і іншыя іспанскія тэрыторыі, апынуўся ў глыбокім крызісе.

## АГАРОДНІНА І САДАВІНА Ў ДЫЕЦЕ ЗВЯЗАНЫ З ПАЗІТЫЎНЫМ УСПРЫМАННЕМ СВЕТУ

Рацыён чалавека напрамую ўплывае на яго настрой. Пра гэта кажуць спецыялісты. Згодна з іх назіраннямі, любоў да агародніны і садавіны гарантуе задавальненне ад жыцця, шчасце і псіхічнае здароўе, піша WebMD. Гэта паказаў аналіз рацыёну 80000 брытанцаў. Чым больш садавіны і агародніны з'ядаў чалавек, тым лепш ён сябе адчуваў. Самымі шчаслівымі былі людзі, якія спажываюць па сем порцый агародніны ў дзень, каментуе Сара Сцюарт-Браўн з Медыцынскай школы Варвік. Прытым адну порцыю навукоўцы разлічвалі прыкладна як 85 грамаў. У маленькім яблыку, да прыкладу, каля 140 грамаў. Тып садавіны ці агародніны не хваляваў навукоўцаў. Спецыялісты не кажуць пра тое, што спажыванне садавіны і агародніны адназначна дапаможа палепшыць якасць жыцця. Магчыма, першапачаткова шчаслівыя людзі часцей спажываюць карысныя прадукты. Сам механізм уздзеяння прадуктаў на ступень задавальнення ад жыцця эксперты выявіць не змаглі. Аднак многія дыетолагі не раз заўважалі: выбудоўванне нармальнага рацыёну паляпшае настрой пацыентам.

ISSN 1990 - 763X

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## НОБЕЛЕЎСКУЮ ПРЭМІЮ МІРУ АТРЫМАЎ ЕЎРАСАЮЗ



У Осла абвясцілі лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру. У 2012 годзе ўзнагароду прысудзілі не чалавеку, а супольнасці дзяржаў — Еўрапейскаму саюзу.

Як растлумачылі арганізатары, ЕС атрымаў прэмію за развіццё дэмакратыі ў Еўропе і прымірэнне паміж краінамі рэгіёна пасля Другой сусветнай вайны. У заяве падкрэсліваецца, што Еўрапейскі саюз уяўляе сабой «братэрства паміж народамі». «ЕС дапамог ператварыць Еўропу з ахопленага вайной кантынента ў кантынент, на якім доўгі час квітнее мір», — гаворыцца ў заяве. У Нарвежскім Нобелеўскім камітэце адзначылі, што прысуджэнне прэміі Еўрасаюзу павінна спрыяць актывізацыі намаганняў яго членаў па пераадоленні пазыковага крызісу.

Паводле інфармацыі Reuters, на рашэнне камітэта ўжо адрэагаваў спікер Еўрапарламента Марцін Шульц, які, паводле яго слоў, ім «вельмі крануты».

У 2012 годзе Еўрапейскаму саюзу споўнілася 60 гадоў: у 1952 годзе было створана Еўрапейскае аб'яднанне вугалю і сталі, на аснове якога пасля сфарміраваўся ЕС.

---

# ЯКІХ ТРАДЫЦЫЙ ПРЫТРЫМЛІВАЮЦЦА Ў ВАШАЙ СЯМ'І?



**Алена Дуброўская, актрыса тэатра і кіно:**

— У кожнай сям'і ёсць свае традыцыі, калі ўсе збіраюцца разам. Так, у нас традыцыяй адзначаць разам Новы год. Нягледзячы на тое, што я ўжо дарослая і жыву асобна ад бацькоў, лічу, што гэтае свята трэба адзначаць у сямейным коле. На Новы год мы робім адзін аднаму падарункі, якія нельга адкрываць раней, чым апоўначы. І гэты рытуал дазваляе адчуць непаўторнасць гэтага падарунка. Разам збіраемся таксама на дні народзінаў, а на Радаўніцу заўсёды ездзім з сям'ёй на могілкі. Таксама мы кожны год традыцыйна адзначаем Дзень сям'і — 15 мая, бо ў свой час у гэты дзень адбылася знакавая падзея ў маім жыцці. Але нават само па сабе гэта свята вельмі важнае. Сям'я — гэта галоўнае, на мой погляд. І няхай у кожнага з нас будуць прычыны апынуцца ў прызначаныя дні ў коле родных і блізкіх людзей.



**Людміла Савіцкая, старшы інспектар аддзела дакументацыйнага забеспячэння БДУІР:**

— У мяне сын нарадзіўся на Новы год, таму гэтае свята ў нас сямейнае. Так ужо павялося: што б мы ні планавалі на гэты дзень, заўсёды застаёмся дома, бо ўзнікаюць нейкія перашкоды. Яшчэ ёсць адна традыцыя з юнацкіх часоў майго мужа, якая стала сямейнай. Ён у мяне будаўнік, таму ў другую нядзелю жніўня яны з сябрамі заўсёды збіраліся на возеры і адзначалі прафесійнае свята. Рыбалка, вогнішча, размовы. Потым, калі ў іх з'явіліся сем'і, пачалі збірацца з сем'ямі. Потым пайшлі дзеці. Так наша кола разрасталася, а традыцыя засталася нязменнай. Гэтай традыцыі ўжо больш за трыццаць гадоў.



**Аксана Катовіч, сааўтар кнігі «Залатыя правілы народнай культуры», этнакультуролаг:**

— Ёсць два святы, якіх асабліва чакаюць у нашай сям'і: адно — зімовае, другое — летняе. Зімой мы ездзім на возера каля вёскі Грабёнка ў Чэрвеньскім раёне, каб адсвяткаваць Вадохрышча і акунуцца ў асвячоную ваду. 18 студзеня разам з жыхарамі гэтай вёскі мы выразаем палонку. Святар асвячае ў ёй ваду, а потым усе ахвотныя могуць праверыць свой дух. А летам, калі святкуем з сям'ёй і сябрамі Купалле, ладзім вогнішча, рыхтуемся па правілах. А калі ад агню застаюцца вугельчыкі, то традыцыйна праходзім па іх басанож. Немагчыма перадаць той настрой, які аб'ядноўвае ўдзельнікаў гэтага свята!

**Падрыхтавала Алена ДРАПКО.**

# ПАДТРЫМКА МАЦЯРЫНСТВА — АДЗІН З ПРЫЯРЫТЭТАЎ ДЗЯРЖАВЫ

**У перыяд з 7 па 14 кастрычніка ў нашай краіне праходзіць Тыдзень маці. Мэта яго — прыцягнуць увагу да самай галоўнай жанчыны ў жыцці кожнага з нас, акружыць яе клопатам і цяплом, абмеркаваць пытанні аховы мацярынства і дзяцінства, павышэння прэстыжу моцнай сям'і.**

Усяго ў рэспубліцы сёння — 1 177 200 сем'яў з дзецьмі. З іх 65% складаюць сем'і з адным дзіцем (764 400 сем'яў), 29,3% — сем'і з дваімі дзецьмі і 5,7% — сем'і з траімі і больш дзецьмі.

Як адзначаюць спецыялісты, у нашай краіне створаны спрыяльныя ўмовы для мацярынства. У Беларусі дзейнічае дзесяць відаў дзяржаўных дапамог сем'ям з дзецьмі. Як паведаміла журналістам **намеснік начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марына АРЦЁМЕНКА**, усяго дзяржаўныя дапамогі ў Беларусі выплачваюцца на звыш чым 447 тысяч дзяцей (ці больш чым на чвэрць ад іх агульнай колькасці).

Прычым заканадаўства ў галіне дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, пастаянна ўдасканальваецца. Узмацняецца сацыяльная абарона сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. З пачатку года павышаны памеры дапамог па доглядзе дзіцяці-інваліда з 65% да 100% бюджэту пражытковага мінімума (БПМ), на дзяцей, старэйшых за 3 гады — з 30% да 50% БПМ. З'явіліся таксама дадатковыя гарантыі пры нараджэнні дзяцей у шматплодных родах: пры нараджэнні двайнят або больш дзяцей на кожнае дзіця выплачваецца дапамога на набыццё рэчаў першай неабходнасці ў памеры 2 БПМ.

Перагледжаны аб'ёмы фінансавай дапамогі шматдзетным сем'ям у пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылля. Пры наяўнасці ў сям'і траіх непаўналетніх дзяцей сума запазычанасці па выдадзеных крэдытах пагашаецца ў памеры 75%, пры наяўнасці чатырох і больш непаўналетніх дзяцей — 100%.

У наступным годзе будуць перагледжаны падыходы да прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сям'і ў перыяд догляду дзяцей. Парламентарыі 8 кастрычніка гэтага года прынялі ў першым чытанні праект закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», дзе прадугледжана, што памер дапамогі на першае дзіця будзе складаць 35% ад сярэднямесячнай заработнай платы, на другое і наступных — 40% сярэднямесячнай заработнай платы.

Акрамя таго, найбольш сацыяльна неабароненым катэгорыям грамадзян плануецца прызначэнне дапамог на дзяцей, старэйшых за тры гады, без уліку даходаў сям'і.

Прадастаўлена права на павышаны памер стандартнага падатковага выліку (246 тыс. руб.) бацькам, якія маюць двух і больш дзяцей (да 1 студзеня 2012 года такое права мелі толькі шматдзетныя бацькі і сем'і, якія выхоўваюць дзіця-інваліда).

З 1 красавіка 2012 года ўсе дзеці ва ўзросце да 3 гадоў забяспечваюцца бясплатнымі лекамі, якія выдаюцца па рэцэптах урачоў у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў.

❍ ❍ ❍

Як адзначае **галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Святлана САРОКА**, здароўе дзіцяці знаходзіцца ў прамой залежнасці ад стану здароўя маці, яе фізічнай і маральнай гатоўнасці да нараджэння дзіцяці. Сёння 96,4% цяжарных звяртаюцца ў жаночыя кансультацыі ў раннія тэрміны цяжарнасці, што важна для бяспечнага мацярынства. Для параўнання: у 2000 годзе гэты паказчык быў роўны 60,7%.

Акрамя таго, у апошнія гады намецілася тэндэнцыя да павелічэння ўдзельнай вагі нармальных родаў. Так, у 2011 годзе 38% родаў працякалі без якіх-небудзь ускладненняў (у 2000 годзе гэты паказчык склаў 24,4%). Ды і ў цэлым, пачынаючы з 2003 года, у нашай краіне назіраецца тэндэнцыя павелічэння нараджальнасці. Так, у 2011 годзе нарадзілася 109 тыс. 364 дзіцяці, што на 23% больш, чым за 2003 год — 88 тыс. 679 дзяцей. А паказчыкі дзіцячай смяротнасці знізіліся з 10,5 на 1 тыс. народжаных жывымі ў 2000 годзе да 3,9 у 2011 годзе (з улікам немаўлят з вагой ад 500 да 999 г) і застаюцца найбольш нізкімі на тэрыторыі СНД.

**Святлана БУСЬКО.**

# ПЕРАТВАРЫЦЬ МУЗЕЙ У ІНДУСТРЫЮ

## ЗБІРАЮЦЦА НА І НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ФОРУМЕ «МУЗЕІ БЕЛАРУСІ»

**Тое, што ў XXI стагоддзі музеі ўжо зусім не тыя, што былі ў XX, зразумела і школьніку. Але як зрабіць так, каб музеі сёння заставаліся сапраўды цікавымі і запатрабаванымі? Адказ на гэтае пытанне будуць шукаць эксперты ў музейнай справе з 18 краін свету, якія з 12 па 14 кастрычніка збяруцца ў Гродне.**

Міністэрства культуры нездарма вырашыла зладзіць форум менавіта ў Гродне. Па-першае, гэты абласны цэнтр — адзін з найстаражытнейшых і найпрыгажэйшых гарадоў Беларусі, і ў будучыні, як заўважыў намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі, мяркуеццаператварыць Гродна ў горад-музей. Па-другое, якраз гэты горад знаходзіцца бліжэй да мяжы з Еўропай, што значна спрашчае збор замежных гасцей у адным пункце, ды і не варта, напэўна, каб усе культурныя падзеі лакалізаваліся толькі ў сталіцы.

Адной з найкарыснейшых мэтаў музейнага форуму з'яўляецца, як ні банальна гучыць, абмен вопытам. І хоць, зноў-такі па словах Стружэцкага, у музейнай справе на фоне іншых краін мы выглядаем даволі добра, усё адно нам відавочна ёсць чаму павучыцца. У беларускіх музеяў ёсць праблемы з захавальнасцю фондаў, неразвітасцю матэрыяльна-тэхнічнай базы... А таму форум у Гродне наведаюць выдатныя знаўцы, вядучыя менеджары музейнай справы.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

Фота БЕЛТА.



# ЗДОЛЬНЫЯ НА ЎСЁ

## РАБОТНІКІ КУЛЬТУРЫ. ЧАСАМ ЯНЫ РОБЯЦЬ БОЛЬШ, ЧЫМ МОГУЦЬ

**Дзень работнікаў культуры — свята галіновае. Але ў гэтай сістэме працуюць жывыя людзі — бібліятэкары, музейшчыкі, артысты і акцёры, многія з якіх нашмат шырэйшыя за тыя рамкі, у якія іх нехта хоча ўпісаць.**

Сёння ў сістэме культуры Беларусі працуе 17 дзяржаўных канцэртных арганізацый, якія аб'ядноўваюць каля 1 500 чалавек артыстычнага персаналу; 3 533 установы клубнага тыпу; 25 700 клубных фарміраванняў, якія аб'ядноўваюць 285 000 удзельнікаў; 500 дзіцячых школ мастацтва і інш. Усяго ў сістэме працуе 65 тыс. работнікаў культуры. І гэта яшчэ без уліку недзяржаўных культурных устаноў: мастацкіх галерэй, кінаклубаў і інш., якія ствараюць дадатковы рэзананс і ўзбагачаюць сучасны беларускі арт-кантэкст.

— Беларуская культура — гэта зорка, якая свеціць усім тым, хто гатовы яе прыняць і зразумець, усім, хто рупліва працуе над яе ўзбагачэннем. Яна — крыніца духоўнага здароўя нацыі і падмурак развіцця нашай дзяржаўнасці, — адзначыў **міністр культуры Павел ЛАТУШКА** на ўрачыстым мерапрыемстве ў Нясвіжы. — Як казаў Уладзімір Караткевіч, выхоўваць любоў да нацыянальнай культуры можна адным толькі спосабам: выхаваннем у чалавеку гордасці за свой народ і яго дзеянні ў гісторыі. І — у сучаснасці — працай, часам непасільнай, па асвеце моладзі, па абуджэнні ў ёй глыбокіх ведаў пра сваіх людзей і свой край. Калі ўсе будуць працаваць над гэтым на мяжы сваіх магчымасцяў — грамадства здолее ўсё.

Сапраўды, што мы ведаем аб працы неабыякавых да беларускай культуры бібліятэкараў якой-небудзь глыбінкі альбо пра змаганне са стэрэатыпамі і страхам перад новым у дзіцячых мастацкіх школах? Альбо, напрыклад, пра клубы гістарычнай рэканструкцыі і танца, якія аматары ладзяць пры якіх-небудзь культурных цэнтрах, каб мець уласнае памяшканне для рэпетыцый. Часцей за ўсё мы проста глядзім сабе пад нос і лічым, што ведаем усё, што робім самае важнае, што толькі мы маем рацыю. І забываем, што за поспехамі абуджэння нацыянальнай свядомасці часта стаяць невядомыя нікому людзі, якія вучаць па-новаму думаць маленькіх беларусаў.

Але гэта лірыка. Калі вярнуцца да рэчаіснасці, то да сёлетняга Дня культуры было прымеркавана наданне звання «Народны артыст Беларусі» артысткам балета: Вользе Гайко, Людміле Кудраўцавай, артысту драматычнага тэатра Сяргею Жураўлю і кіраўніку Белдзяржцырка Таццяне Бандарчук. Адзінаццаці работнікам культуры і мастацтва прысвоены ганаровыя званні «Заслужаны артыст», «Заслужаны дзеяч мастацтваў», «Заслужаны дзеяч культуры». 39 чалавек узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Усяго за 2012 год у сферы культуры прынята больш за 40 нарматыўна-прававых актаў. А на 2013 год плануюцца змены ў законы аб бібліятэках і бібліятэчнай справе, аб народнай творчасці і народных промыслах, распрацоўваецца праект Кодэкса аб культуры. Спадзяемся, што ўсе наватарствы, якія адбываюцца ў заканадаўстве адносна культуры, будуць толькі спрыяць яе адраджэнню і развіццю, а таксама паляпшаць і спрашчаць умовы працы і жыцця людзей мастацтва і культуры, ад якіх у нашай краіне насамрэч так шмат залежыць.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# ВЕЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ РАДЗІВІЛАЎ

## КАНЦЭПЦЫЯ РЭСТАЎРАЦЫІ НЯСВІЖСКАГА ПАЛАЦА АБАПІРАЛАСЯ НА ЛЕПШЫЯ ЎЗОРЫ, КАЛІ ЁН ПЕРАЖЫВАЎ НАЙВЯЛІКШЫ ЎЗДЫМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Важна і тое, што значна палепшылі ўмовы працы для нашых супрацоўнікаў, адрамантавалі памяшканні. У цэнтральным офісе, напрыклад, не было ацяплення — зімой людзі вымушаны былі працаваць у верхнім адзенні. Цяпер жа зрабілі кацельню, яшчэ дзве мадэрнізавалі, правялі да будынка газ. Варта сказаць, што калектыў папоўніўся маладымі творчымі супрацоўнікамі амаль напалову. Актыўна мы працуем з мясцовымі ўладамі па кіраванні аб'ектамі горада. У прыватнасці, дамагліся таго, што без узгаднення з нашымі спецыялістамі ніхто не мае права знесці ці пабудаваць нешта ў старой частцы Нясвіжа.

У сваёй праграме я прапаноўваў стварэнне летняй школы для студэнтаў творчых спецыяльнасцяў. Зараз вядзём працу, каб рэалізаваць праект на пляцоўцы былога кляштара езуітаў. На 2 гектарах зямлі мяркуем арганізаваць месца, дзе змогуць праходзіць практыку студэнты вышэйшых навучальных устаноў. Там плануюцца творчыя і рэстаўрацыйныя майстэрні, кавярня, кампус. Хацелася б, каб з гэтай пляцоўкі пачалася рэгенерацыя Нясвіжа, трэба паказаць, як можна па-сучаснаму працаваць з гістарычным ландшафтам. Па прапанове музея гэты аб'ект праектуюць студэнты-архітэктары выпускных курсаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

У маіх планах — адкрыццё аграсядзібы непадалёку ад Нясвіжа. Вельмі хацелася б стварыць там і парк хатніх жывёл.

***— Не сакрэт, што апошнім часам цікавасць да палаца Радзівілаў значна ўзрасла. Ледзьве не кожны беларус лічыць за гонар тут пабываць. Бясспрэчна, гэта добра, што суайчыннікі хочуць больш ведаць пра сваю гісторыю. І тым не менш менавіта павышаны ажыятаж стварае дадатковыя праблемы. Ці не так?***

— За 9 месяцаў сёлета палац наведалі 302 тыс. чалавек, у тым ліку за апошнія два месяцы — 105 тысяч. Бясспрэчна, замак можа прыняць і больш людзей. Але праблема ў тым, што прыязджаюць турысты звычайна ў пятніцу, суботу і нядзелю. З панядзелка па чацвер — толькі некалькі груп штодзень. Адначасова ў палацы можа знаходзіцца не больш за 400 чалавек, паколькі «перагрузка» стварае небяспеку як для саміх людзей, так і для экспанатаў. У сувязі з наплывам гасцей і летняй спёкай аператыўна закуплялі асушальнікі паветра, дадатковыя кандыцыянеры. У далейшым плануем абмежаваць прыём наведнікаў у выхадныя дні, таму вывучаем вопыт заходніх музеяў (у прыватнасці, парыжскага Луўра) па ўстаноўцы турнікетаў і ўводзе электронных білетаў, разлічаных на 1,5 гадзіны знаходжання ў палацы. У той жа час камп'ютар будзе весці ўлік таго, колькі чалавек адначасова знаходзіцца ў залах.

Сёння ў штаце музея 26 экскурсаводаў, але іх недастаткова. Ім на дапамогу прыходзіць тэхніка. У першым пускавым комплексе палаца працуе 35 аўдыягідаў. Пракат аднаго каштуе 10 тысяч рублёў. Хутка з'явіцца яшчэ 150 аўдыягідаў з тэкстам на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай. Гэта сучасныя прылады з лазерным сканерам, які сам знаходзіць патрэбныя аб'екты па адпаведных кодах, нанесеных на іх. Па горадзе такая праграма ўжо распрацавана, з раённымі ўладамі ўзгадняецца, як больш эстэтычна замацаваць гэтыя «малюнкі».

Для таго, каб часткова разгрузіць музей, мы таксама распрацавалі экскурсійны маршрут па замкавых валах з наведваннем падземных камунікацый. Засталося высветліць іх тэхнічныя магчымасці: колькі чалавек і на якіх умовах можам туды запусціць. У наступным годзе плануем абсталяваць тут пляцоўку з артылерыйскімі гарматамі, зрабіць рэканструкцыю артылерыйскага бастыёна. Будуць адліты адна ці некалькі гармат.

***— Што яшчэ новага і цікавага чакае наведнікаў у бліжэйшай перспектыве?***

— Працуем над экспазіцыяй, прысвечанай легендам Нясвіжа. Гэта і Чорная панна Нясвіжскага замка, і Скарбчык Радзівілаў. Спадзяюся, у будучым годзе гэтыя экспазіцыі адкрыюцца. Мяркуем пачаць праект і па стварэнні дзіцячага музея, каб бацькі змаглі пакінуць там сваіх малых і спакойна гуляць па палацы і парках.

Практыкуем мы і правядзенне касцюміраваных баляў. Першае такое мерапрыемства апрабавалі ў Ратушы. Гэтай восенню ўпершыню ў палацы Радзівілаў ладзіцца Княжы баль, прымеркаваны да кінафестывалю «Лістапад». У ім прымуць удзел 300 VIP-персон, у тым ліку Анастасія Валачкова, Дзмітрый Харацьян, Міхаіл Шырвінт. Яшчэ 100 білетаў могуць набыць усе ахвотныя.

Для гасцей паставім шацёр плошчай прыкладна 500 метраў з ацяпленнем і паркетнай падлогай для танцаў. Абслугоўванне таксама плануецца на высокім узроўні. Збудаванне будзе размешчана так, каб госці змаглі трапіць у палац, не выходзячы на вуліцу. Для тых, хто набыў білеты дадаткова, у адной з залаў (хутчэй за ўсё, Гетманскай) будзе зроблены спецыяльны подыум для танцаў, каб не псаваць падлогі. Іх пачастуюць шампанскім, прапануюць забаўляльныя праграмы. Гэтае свята, якое працягнецца да раніцы, мы ладзім разам з Міністэрствам культуры і берлінскай кампаніяй «Берынартменеджмен». З гэтай замежнай кампаніяй мы хацелі б арганізаваць навагоднія і калядныя святы.

***— У музеі-запаведніку, на мой погляд, апошнім часам таксама навучыліся зарабляць грошы на яго развіцці. Не памыляюся?***

— Нясвіжскі музей першы сярод беларускіх музеяў зарабіў больш за 8 млрд рублёў на паслугах, білетах, арэндзе. Здаём у арэнду 2 гасцініцы, 2 рэстараны, кавярню, вытворча-тэхнічныя памяшканні. У двух крамах, што знаходзяцца ў замку, даволі паспяхова прадаюцца сувеніры з лагатыпам і сімволікай музея-запаведніка. Напрыклад, мы прапаноўвалі ў наступным годзе часткова адмовіцца ад дзяржаўнага фінансавання, скажам, у пытаннях закупкі абсталявання, тэхнікі, экспанатаў. У заходніх музеях (у прыватнасці, у тым жа Луўры) на адваротным баку білета зроблены надпіс: маўляў, сродкі, патрачаныя на набыццё білетаў, ідуць на пакупку экспанатаў. Мы таксама маглі б так зрабіць.

**Неабходна стварыць для турыстаў такія ўмовы, каб яны заставаліся тут надоўга. Агульнавядома, што справа не ў колькасці наведнікаў, а ў тым, колькі грошай яны пакінуць у рэгіёне.**

У Нясвіжы пакуль яшчэ не хапае як аб'ектаў інфраструктуры, так і аб'ектаў для наведвання. Наша мэта — стварыць іх як мага больш, паколькі мы найбольш буйная структура, здольная генерыраваць новыя ідэі і ажыццяўляць іх. Неабходна стварыць для турыстаў такія ўмовы, каб яны заставаліся тут надоўга. Агульнавядома, што справа не ў колькасці наведнікаў, а ў тым, колькі грошай яны пакінуць у рэгіёне. Музей-запаведнік «завязаны» ў рэгіянальную эканоміку, гэта градаўтваральны аб'ект. Ён заўсёды быў такім: Радзівілы спачатку ўзвялі замак, а ўжо потым рэканструявалі і будавалі горад. Таму хочацца, каб з'явілася больш аб'ектаў для турыстаў.

Патэнцыял для далейшага развіцця ёсць, можна працаваць з гістарычнымі ландшафтамі, больш актыўна асвойваць тыя аб'екты, што ёсць. Працаваць тут цікава, хоць і ёсць пэўныя цяжкасці. Няпроста набраць калектыў і захаваць яго, паколькі няма жылля. Музей стварыў жыллёва-будаўнічы кааператыў. Але гэта не вырашыць праблемы. У маладых спецыялістаў недастаткова сродкаў, каб будавацца ў ЖБК.

Разам з тым, дадам, што ўкладзеныя ў рэстаўрацыю аб'ектаў каласальныя сродкі працуюць і прыносяць свой плён. Шмат увагі надаём рэкламе, прапагандзе брэнда «Нясвіжскі палац». У нас створаны спецыяльны аддзел па сувязях з грамадскасцю, у штаце якога 4 спецыялісты разам з маркетолагам. Маем свой сучасны інтэрактыўны сайт, дзе можна заказаць білеты. З намі заключана больш за 560 тысяч дагавораў на экскурсійнае абслугоўванне.

***— Сяргей Міхайлавіч, вы чалавек творчай прафесіі, гуманітарый. Як удаецца спалучаць гэта з арганізатарскімі, гаспадарчымі функцыямі?***

— На самой справе я прафесійны гісторык. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і дактарантуру Люблінскага каталіцкага ўніверсітэта, у 2000 годзе абараніў дысертацыю на атрыманне ступені доктара гісторыі, аўтар трох кніг, мноства публікацый. Але ў нясвіжскі праект я свядома прыйшоў як дырэктар. У музеі ёсць адмысловыя аддзелы, якія займаюцца навуковымі даследаваннямі. Разам з тым, так ці інакш займаюцца навуковай працай і супрацоўнікі Ратушы, самога замка. Зараз з выхадам на праектную магутнасць з'яўляецца магчымасць і самому ўдзельнічаць у навуковых канферэнцыях, праводзіць даследаванні. У маіх планах таксама і навуковыя работы па гісторыі роду Радзівілаў.

***— У рэстаўрацыю Нясвіжскага палаца, Сяргей Міхайлавіч, укладзены не толькі вялікія сродкі, але і высілкі таленавітых спецыялістаў, архітэктараў, навукоўцаў. І тым не менш знаходзяцца крытыкі. Як вы асабіста ставіцеся да гэтых выпадаў?***

— Сапраўды, знаходзяцца людзі з ненавуковага асяродку, якія размяшчаюць у сецінве ананімныя пасквілі: і гэта не так, і тое. Маркерам неканструктывізму з'яўляецца тэма пластыкавых вокнаў: маўляў, нават на гэтым зэканомілі. Такога няма і не магло быць наогул. Двойчы ў замку пабывала камісія ЮНЕСКА, якая вельмі высока ацаніла ўзровень рэстаўрацыі. Прыязджаюць сюды і еўрапейскія калегі, якія па-добраму зайздросцяць, што наша дзяржава змагла аднавіць і насыціць музейнымі экспазіцыямі такі гістарычны аб'ект. Вельмі пазітыўна ацэньваюць работу мае калегі з Польшчы: дырэктар Каралеўскага замка ў Варшаве, дырэктар Вільянаўскага палаца, спецыялісты з кракаўскага Вавеля. А вось у нашай краіне чамусьці знаходзяцца недасведчаныя ў гісторыі суайчыннікі, якія незадаволены літаральна ўсім.

***— Што вы маеце на ўвазе?***

— Прачытаў у інтэрнэце, у прыватнасці, сцвярджэнне, што на гербе Радзівілаў «не ў той бок павернуты арол». Нават прадстаўнікоў магнацкага роду такія заявы раздражняюць. У прыватнасці, Мікалай Радзівіл адказаў, што гэта тыя нюансы геральдыкі сям'і, якія члены сям'і вырашалі самі. На заявы невукаў ад гісторыі трэба губляць час: даваць абвяржэнні, тлумачэнні. У рэшце рэшт, прыдуманыя імі «сенсацыі» не садзейнічаюць іміджу радзівілаўскай спадчыны канкрэтна і нашай дзяржавы ў цэлым.

Што датычыцца заяў, што не так зроблена экспазіцыя, то тут мы наогул сутыкаемся з гістарычнай маладасведчанасцю. Напрыклад, у інтэрнэце выкладзена падборка фотаздымкаў палаца ў перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі: маўляў, вось такім чынам ён заўсёды выглядаў. Справа ў тым, што палац за стагоддзі свайго існавання неаднойчы разбураўся, рабоўваўся. У канцы XIX стагоддзя Радзівілы спрабавалі яго аднавіць, але не паспелі: пачалася Першая сусветная вайна.

Для Радзівілаў палац быў не проста месцам для жылля — ён дэманстраваў магутнасць, уладу, багацце, славу гэтага старажытнага роду. Радзівілы стварылі цэлую праграму яго аздаблення. Былі залы Славы Мікалая Радзівіла Чорнага, Біржанскай лініі Радзівілаў, Гетманаўская зала, рэпрэзентатыўныя пакоі. На пачатку XVIII стагоддзя замак стаў сапраўднай жамчужынай. Нават польскія каралі, прыязджаючы сюды, адчувалі сябе беднякамі — як, напрыклад, той жа Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, які гасцяваў у Пана Каханку. Канцэпцыя рэстаўрацыі абапіралася менавіта на гэтыя ўзоры, пачэрпнутыя з архіўных крыніц, калі палац перажываў найвялікшы ўздым. Радзівілы, якія валодалі замкам у перыяд паміж сусветнымі войнамі, таксама імкнуліся гэта зрабіць, але ў іх не хапала сродкаў. Напрыклад, на фота відаць, што адзін і той жа гарнітур перастаўляецца з месца на месца. Частку замка Радзівілы наогул вымушаны былі аддаць пад гімназію. А ў Першую сусветную тут размяшчаўся лазарэт. На той час ужо даўно былі страчаны многія ўпрыгажэнні залаў, карціны, пазалота, дарагая мэбля. Зараз мы сутыкаемся з тым, што людзі ўспрымаюць гісторыю цыклічна: так было на здымках — значыць, так было заўсёды. Але за 400 гадоў свайго існавання і нават на працягу жыцця аднаго пакалення палац пастаянна мяняўся. Калі пайшла мода на плоскую распісную столь, то ў залах здымаліся скляпенні. А вось яшчэ адзін прыклад. На адным з фота ў Вялікай сталовай за вячэрай сядзяць госці замка на танных венскіх крэслах, якія на той час былі амаль у кожнай сялянскай хаце. Дык што, сучасныя рэстаўратары, гісторыкі, мастацтвазнаўцы павінны прытрымлівацца не самых лепшых узораў, аднаўляючы аб'ект сусветнай спадчыны, паказаць непрэзентабельнасць міжчасся? На гэта не патрэбны былі б і грошы, неабходна было проста пафарбаваць сцены. Таму лямант безыменных аўтараў не што іншае, як спроба заявіць аб сабе, зрабіць піяр на праекце, да якога яны не прычыніліся. Дзе яны былі, калі мы збіралі ахвяраванні на рэканструкцыю гадзіннікавай вежы ці набыццё на аўкцыёнах радзівілаўскіх артэфактаў? А калі такім людзям пачынаеш адказваць прафесійна, з пункту гледжання гісторыка, яны знікаюць.

Але радуе тое, што большасць суайчыннікаў лічыць комплекс гонарам Беларусі і, прыязджаючы сюды, галасуюць за яго асабістым рублём.

***— А што за гісторыя з нядаўна распаўсюджаным адкрытым лістом, які датычыцца асабіста вас як дырэктара музея-запаведніка?***

— Нібыта яго напісала супрацоўніца музея з абвінавачваннем мяне ў страшэнных рэчах, якіх я ніколі не рабіў. Але чалавек з такім прозвішчам у штаце не значыцца, калектыў музея абураны нахабнай хлуснёй ананіма. Сам ліст напісаны ў лепшай манеры 1930-х гадоў, калі «сігналаў» з месца было дастаткова... Калі раней я на такія выпады не рэагаваў, то цяпер вымушаны звярнуцца ў праваахоўныя органы, каб дабіцца пакарання паклёпніка.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■

## Лепшы галоўны бухгалтар краіны працуе ў Віцебску

Фінал конкурсу «Лепшы галоўны бухгалтар года» адбыўся ў Мінску. Па выніках усіх выпрабаванняў самым лепшым галоўным бухгалтарам краіны ў 2012 годзе прызнана Ала Міклушова з віцебскага ТАА «Дыполь». Сёлета ў конкурсе прынялі ўдзел 640 спецыялістаў, аднак да фіналу, акрамя Алы Пятроўны, дайшлі толькі Наталля Аленева (СТАА «Неро Электронікс») і Алена Роўбуць (ЗЗАТ «Еўратрансэнерга»). Конкурс упершыню быў праведзены ў 2001 годзе, і, як адзначаюць арганізатары (часопіс «Галоўны Бухгалтар»), яго папулярнасць і ўзровень падрыхтоўкі ўдзельнікаў растуць год ад года.

**Іван СТУЖКА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

### Организатор: Каменский сельский исполнительный комитет

| № лота | Вид аукциона, целевое назначение | Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документов, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома | аг. Камень, ул. Школьная, У-2, Лепельского района, площадь 0,1571 га, кадастровый номер 222781706601000236 | - водоохранная зона озера «Дворное» и охранная зона линии электропередачи свыше 1000В; - получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство | 3 084 000 | 10000000 | 1000000 |
| 2. | В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома | аг. Камень, ул. Школьная, У-8, Лепельского района, площадь 0,1677 га, кадастровый номер 222781706601000235 | - водоохранная зона озера «Дворное»; - получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство | 3 084 000 | 10000000 | 1000000 |
| 3. | В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома | аг. Камень, ул. Школьная, У-10, Лепельского района, площадь 0,1682 га, кадастровый номер 222781706601000234 | - водоохранная зона озера «Дворное»; - получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство | 3 084 000 | 10000000 | 1000000 |

1. **Аукцион состоится 23 ноября 2012 года в 15.00 по адресу: Витебская область, Лепельский район, агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а.**

2. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: агрогородок Камень, улица Ленинградская, 25а, Каменский сельский исполнительный комитет. Последний день приема заявлений **19.11.2012 года до 17.00.**

3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10% от начальной цены объекта аукциона в кассу Каменского сельисполкома.

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования. Представителем гражданина — нотариально удостоверенную доверенность, удостоверяющую личность, а также предъявляет паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, публикации в средствах массовой информации и расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о передаче в частную собственность победителю аукциона земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

**Контактные телефоны: 8(02132) 2 39 62; 8 (029) 713 99 41.**



## Извещение о проведении 14 ноября 2012 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов, сведения об обременениях | Местонахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | «Встроенное административное помещение на первом этаже жилого дома» общей площадью 179 кв. м, инвентарный номер (кадастр.) 500/D-691282 (обременено арендой) | г. Минск, ул. Лазо, д. 10, пом. 1Н | 1 536 400 000 | 153 000 000 |
| 2. | «Встроенное административное помещение на первом этаже» общей площадью 150,6 кв.м, инвентарный номер (кадастр.) 500/D-691281 (обременено арендой) | г. Минск, ул. Лазо, д. 6, пом. 1Н | 1 302 600 000 | 130 000 000 |
| 3. | «Торговое помещение» общей площадью 922,7 кв. м, инвентарный номер (кадастр.) 500/D-681621 (обременено арендой) с установленным оборудованием: автоматическая установка охранно-пожарной сигнализации, инв. № 4508520 | г. Минск, пр-т Партизанский, д. 128, пом. 1Н | 5 458 345 121 | 540 000 000 |
| 4. | «Административно-торговое помещение № 1Н» общей площадью 146,9 кв. м, инвентарный номер (кадастр.) 500/D-683907(обременено арендой) | г. Минск, пр-т Партизанский, д. 104, пом. 1Н | 1 558 400 000 | 155 000 000 |
| 5. | Незавершенное законсервированное «здание корпуса № 2» готовностью 58 процентов и общей площадью 20354,4 кв. м, инвентарный номер (кадастр.) 700/U-83233 | г. Могилев, ул. Крупской, 232 | 17 063 687 399 | 1 000 000 000 |

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов – задаток вносится для каждого из предметов торгов), заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

**Торги состоятся 14 ноября 2012 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 15.10.2012 по 12.11.2012 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

**Телефоны для справок:**

**(017) 327 48 36 – (УП «Минский городской центр недвижимости»);**

**(017) 217 21 03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).**

**ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ «БЕЛАРУСКІ САЮЗ ЖАНЧЫН» ВІНШУЕ ЎСІХ МАЦІ СА СВЕТЛЫМ І ДУШЭЎНЫМ СВЯТАМ — ДНЁМ МАЦІ!**

**Слова «мама» — гэта ўвасабленне любові і цеплыні, таго самага блізкага чалавека, у чым сэрцы б'е чыстая крыніца пяшчоты і гатоўнасці ахвяраваць усім дзеля сваіх дзяцей. Часта занадта позна мы заўважаем, што ўсё, чаго мы дабіліся ў жыцці, атрымалася дзякуючы маме. Яе цёпламу, ненавязліваму, часам проста незаўважнаму ўдзелу.**

**Мацярынства — самая вялікая мара і дасягненне кожнай жанчыны. Працягваць жыццё ў дзецях, перадаваць ім мудрасць, маральныя асновы — гэта натуральнае імкненне любой жанчыны.**

**Мілыя, дарагія мамы, няхай вас грэюць любоў і ўдзячнасць вашых мужоў, дзяцей і ўнукаў, а ў вашых вачах не гаснуць усмешкі!**

**Шчасця, здароўя, дабрабыту, душэўнага спакою і кахання!**

# ШЧАСЛІВАЯ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Участак пад будаўніцтва Гаркалюкам выдзелілі ў раёне, які цяпер называюць Плоска-Машчонка, а па сутнасці, гэта ваколіца вёскі Машчонка Брэсцкага раёна, якая нядаўна ўвайшла ў межу абласнога цэнтра. Даехаць сюды грамадскім транспартам пакуль немагчыма. Гэта аўтар радкоў выпрабавала на сабе. 19-й маршруткай ці 39-м аўтобусам даязджаеш да вуліцы Верасковай. А там яшчэ кіламетры тры трэба ісці пешшу. Але ж побач — лес, свежае паветра, вясной і летам — дзівосная прырода, прыгожыя краявіды.

Дом жа пакуль не дабудавалі. Крэдыт на ўзвядзенне атрымалі, а будматэрыялы ўзялі і падаражэлі. Але тры жылыя пакоі і кухня гатовы, на падыходзе гасцёўня. Астатняе давядзём да ладу паступова, разважае Аксана. Крэдыт выплачваць не трэба: ён пагашаны дзяржавай. У будаўніцтве дапамагалі родныя і Аксаны, і Валерыя. Ды і самі гаспадары ўсё ўмеюць: і сцены ўзводзяць, і аддзелку рабіць. Праўда, цяпер будоўля крыху затармазілася. Муж-будаўнік прыходзіць з працоўнай змены стомлены, вечарам вельмі не разгонішся. Ды і грошай асабліва няма. Штодзённыя патрэбы двух школьнікаў і трох дашкольнікаў вымагаюць нямала сродкаў. «Схадзіла на два бацькоўскія сходы, — прыводзіць прыклад маці, — і мільёна няма. Аднаго абутку колькі трэба ў сям'ю кожны сезон!» Добра, што бацькі, браты, сёстры дапамагаюць. Аксана — малодшая ў сям'і, у маці іх усяго чацвёра. Старэйшыя забяспечваюць пляменнікаў вопраткай. А вось ад бацькоў са Столінскага раёна сям'я мае рэгулярную падмогу ў выглядзе бульбы, мяса, іншай сельгаспрадукцыі.

Вельмі шмат дапамагаюць і бацькі мужа. Дзеці ходзяць у школу і садок у мікраёне «Усход» — гэта процілеглы канец горада. Вучняў пасля ўрокаў ды і малых з садка забірае бабуля. А бацькі прыязджаюць, каб забраць дзяцей толькі вечарам, пасля працоўных змен. А раніцай развозяць іх па ўстановах адукацыі. Таму без дзвюх аўтамашын, якія мае сям'я, тут проста не пражывеш, не паспееш нікуды. Гэта зноў дадатковыя, але неабходныя расходы. Інакш панясеш пяцёра дзяцей на аўтобусны прыпынак за некалькі кіламетраў, асабліва зімой, у сцюжу. І хоць стараюцца з усіх сіл Аксана і Валерый, але, відавочна, без падтрымкі сваіх родных з абодвух бакоў немагчыма было б справіцца. І дзеці змалку засвойваюць адзін з самых важных урокаў у жыцці — аб сапраўднай каштоўнасці вялікай сям'і, аб уменні спачуваць блізкім.

Што яшчэ дапамагае трымаць усмешку гэтай жанчыне? Узаемаразуменне і падтрымка мужа. Дзеці яшчэ малыя. Асабліва, калі хвараюць, — бывае, і ноч даводзіцца прастаяць (хто дзяцей гадаваў, ведае). «Я паўночы не сплю, а потым ён устане, мяне падменіць, — кажа Аксана. — А раніцай усталі і пайшлі, бадзёрыя, на працу». У выхадныя бацька займаецца «культурнай праграмай». Так у іх называецца паход выхаднога дня, калі ўсе дзеці з бацькам едуць у кінатэатр, цырк, на выставу, у парк, а маці тым часам мае магчымасць як след прыбраць у кватэры. У Белавежскую пушчу, на іншыя экскурсіі выбіраюцца звычайна ўсёй сям'ёй.

Хацелі сёлета з'ездзіць усе разам на мора, але пакуль не атрымліваецца. Калі нешта нельга зрабіць альбо купіць зараз, стане магчыма потым, — гэта адзін з выхаваўчых прынцыпаў бацькі сямейства, які дзеці добра засвоілі. І ніхто не хныкае, не просіць без асаблівай прычыны. Хоць зноў жа бацька лічыць сваім абавязкам утрымліваць сям'ю так, каб дзеці не лічылі сябе абдзеленымі, таму што, маўляў, яны са шматдзетнай сям'і. Проста ніхто не дазваляе сабе нічога лішняга, і ўсё маюць неабходнае. Старэйшая дачка Карына, вучаніца пятага класа, збіраецца на асенніх канікулах на экскурсію ў Германію. Едуць многія дзеці з іх класа, а дзяўчынка вывучае нямецкую мову, ёй будзе і цікава, і карысна. 200 еўра на паездку на сямейным савеце вырашана было выдаткаваць. Ну і бабулі-дзядулі таксама прынялі пасільны ўдзел у фінансаванні паездкі ўнучкі.

**У выхадныя бацька займаецца «культурнай праграмай». Так у іх называецца паход выхаднога дня, калі ўсе дзеці з бацькам едуць у кінатэатр, цырк, на выставу, у парк...**

Не маюць звычкі ў гэтай сям'і асабліва перабіраць з ежай. Праўда, да ўсіх розныя густы. Але маці і гатуе з улікам усіх сімпатый. І тое, што пастаўлена на стол, дружна і з удзячнасцю з'ядаецца. Нядаўна купілі хлебапечку, і цяпер на стале часта бываюць свае хлеб, булкі, пірагі. Гэта любяць усе. На раніцу звычайна гатуецца каша з ягадамі (ягад намарозілі на цэлы год), а вечарам сур'ёзная вячэра, за якой збіраецца ўся сям'я. Сямейныя абеды цяпер сталі раскошай выхаднога дня.

Звяртаю ўвагу на прыклееныя да шпалер рамонкі над вялікім абедзенным сталом. Аказалася, узаконеная дзіцячая творчасць. Сапраўды, не толькі ж тузаць дзяцей: там не малюй, гэтага не пэцкай, — падумалі аднойчы Аксана і прапанавала кожнаму зрабіць свой рамонак з паперы, умацаваць яго на сцяне. А ў сярэдзіну кветачкі прыляпілі кожны свой фотаздымак — Карына, Юля, Дзіма, Саша і Рома. Вось такая кампазіцыя атрымалася. Яшчэ маці са старэйшымі робіць цікавыя шкатулкі, рамкі, цацкі з макароны. Праўда, цяпер часу няма. А любімы дзіцячы занятак — даглядаць кацянят і сабачку. Ім нехта падкінуў кошку на парог. Яе прыгрэлі, падкармілі. Неўзабаве на ганку з'явіліся пяць шэрых кацянят, якія знаходзяцца тут на правах законных жыхароў, бо нарадзіліся на падворку.

Дзеці ў вялікай сям'і растуць больш працавітымі, умеюць дапамагаць адно аднаму, лепш шануюць бацькоў. Гэта аксіёма. Нават выхавацелі дзіцячага садка адзначаюць, што такія дзеці лягчэй праходзяць адаптацыю да новых умоў, з імі амаль няма праблем. Усё гэта недзе на падсвядомым узроўні засвоіла Аксана яшчэ ў сваёй сям'і, ад сваёй маці. Яе родная мама, а потым і мама Валерыя сталі сапраўдным прыкладам служэння дзецям. Са свекрывёй ёй вельмі пашанцавала. Яны нават падобныя знешне. Здаралася, малазнаёмыя людзі прымалі яе за дачку Надзеі Мікалаеўны. Цяпер ужо перад дзвюма мамамі няёмка раскіснуць, паказаць сваю слабасць, не справіцца.

І яна абавязкова справіцца. Кажа: «Бывае зусім цяжка, здаецца, усё, сіл больш няма. Мяжа. Але глянеш на дзяцей — і мімалётны адчай як рукой здымае. Дзеці даюць сілы... Гэта ж радасць вялікая, дарунак Божы. Толькі б здароўе не падводзіла. Усё астатняе нажывецца...».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# РЭСПУБЛІКА ДЗІЦЯЧЫ ДОМ

**КАЛІ чалавек чуе пра дзіцячы дом, у яго ўзнікаюць самыя розныя асацыяцыі. Людзям старэйшага ўзросту прыгадваюцца савецкія кінастужкі «Рэспубліка ШКІД» і «Пуцёўка ў жыццё». Хтосьці прыгадае легендарную «Педагагічную паэму» Антона Макаранкі. Здараецца і так, што ў кагосьці дзіцячы дом можа цвёрда асацыявацца з некаторымі атрыбутамі калоніі. Але апошняе меркаванне з'яўляецца ўсяго толькі ўстойлівым стэрэатыпам. Яго разбурэнню актыўна садзейнічае масавае стварэнне дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. Па сутнасці, дзеці пачынаюць жыць у вялікай дружнай сям'і, як гэта ў ідэале і павінна быць. У адзін такі дзіцячы дом, які размясціўся ў Маскоўскім раёне сталіцы, і завіталі карэспандэнты «Звязды».**



Фота Надзеі БУЖАН.

## «У ДЗЯЦЕЙ З'ЯЎЛЯЮЦЦА КЛАПАТЛІВЫЯ БАЦЬКІ»

Спецыяліст сектара па ахове дзяцінства ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Маскоўскага раёна горада Мінска Алена Ламакіна кажа, што для малых вялікае шчасце — знаходзіцца ў такім дзіцячым доме:

— Па-першае, у іх з'яўляюцца клапатлівыя бацькі. Бо фактычна гэта сям'я, дзе на поўным дзяржаўным забеспячэнні выхоўваюцца ад пяці да дзесяці сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Па-другое, яны набываюць бясцэнны вопыт пражывання ў сям'і. Іх пастаянна выхоўваюць адны і тыя ж людзі. Штодня яны вучацца клапаціцца адзін аб адным, наладжваць адносіны паміж усімі членамі сям'і. Яны спазнаюць і іншыя жыццёва неабходныя рэчы, з якімі сутыкнуліся б у дарослым жыцці па-за сценамі інтэрната. Увогуле, пакуль што дзіцячыя дамы сямейнага тыпу не выцясняюць класічныя інтэрнаты, але з'яўляюцца для іх цудоўнай альтэрнатывай.

Яны маюць статус установы адукацыі і карыстаюцца адпаведнымі юрыдычнымі правамі. Першы такі дом быў арганізаваны на тэрыторыі Маскоўскага раёна сталіцы ў 1998 годзе. Цяпер жа іх колькасць дарасла да 17. Сёлета за 9 месяцаў у раёне знайшлі новую сям'ю дванаццаць дзетак. Летась іх было дзесяць.

Каб стварыць дзіцячы дом сямейнага тыпу, на долю кожнага члена сям'і і выхаванца павінна прыпадаць не менш за 15 квадратных метраў плошчы жылля. Бацькамі-выхавальнікамі могуць стаць дзеяздольныя муж і жонка, прытым яны мусяць быць сталейшыя за 25 гадоў. У іх не павінна быць канфліктаў з законам. Калі хоць аднойчы кагосьці з іх пазбавілі бацькоўскіх правоў, то гэтая акалічнасць паставіць крыж на імкненні пары стварыць сямейны дзіцячы дом.

Вельмі часта бацькамі-выхавальнікамі становяцца людзі, якія атрымалі педагагічную альбо медыцынскую адукацыю. Значная доля — альтруісты, якія мараць аб вялікай сям'і.

Дзеці, якія выхоўваюцца ў дамах сямейнага тыпу, падтрымліваюцца з боку дзяржавы. Для іх вызначаны нормы матэрыяльнага забеспячэння і льготы, прадугледжаныя заканадаўствам для дзяцей, якія знаходзяцца ў адпаведных інтэрнатных установах. Напрыклад, ім гарантаваны бясплатны праезд у гарадскім транспарце, яны маюць права бясплатна наведваць любыя гурткі і спартыўныя секцыі. Двойчы на год дзіця можа адпачыць за мяжой альбо ў летніку. За выхаванцамі замацаваны льготы і пры паступленні ў навучальную ўстанову для набыцця прафесійнай адукацыі пасля заканчэння школы.

## «ХТОСЬЦІ ПРЫХОДЗІЦЬ, КАГОСЬЦІ ЗАБІРАЕ СЯМ'Я»

Маці-выхавальніца Таццяна Журык лічыць, што арганізаваць дзіцячы дом сямейнага тыпу мала. Трэба яшчэ навучыць малых таму, што звычайна могуць, умеюць і ведаюць іх аднагодкі са звычайных сем'яў. І, вядома ж, быць добрым псіхолагам.

— У 1999 годзе абставіны склаліся так, што мне давялося звольніцца з працы. Па адукацыі я медсястра. Пабудавалі дом у Мар'інай Горцы, і дабірацца на працу стала вельмі нязручна. Пакуль сядзела дома, зразумела, што чагосьці не хапае. А ў гэты час якраз стартавала сацыяльная рэклама «Знайдзі мяне, мама». Хацелася ўзяць маленькую дзяўчынку, але дзевяцігадовы сын папрасіў: «Дайце мне сябра». Так мы знайшлі дзевяцігадовага Аляксея. У свае гады ён лічыў, што бульба расце на дрэвах, як яблыкі! І мы пачалі вучыць яго агульнавядомым рэчам. А пасля забралі з дзіцячага дома яго маленькую сястру. Так нас стала больш. Немалаважную ролю адыграла маральная падтрымка з боку мужа. Але, на жаль, ідэю не падтрымалі яго бацькі. Складана сказаць, чаму... Ужо цяпер, праз гады, прыйшла да высновы, што гэта і было маё прызванне. У Пухавіцкім раёне я стварыла клуб прыёмных бацькоў і доўгі час была яго старшынёй.

Сёння ў нас васьмёра дзяцей, у тым ліку шэсць выхаванцаў. Самы старэйшы — гэта Мікіта, яму ўжо амаль 22 гады. Ён вучыцца ў Беларускім агратэхнічным універсітэце. Дзянісу 15 гадоў, Наташы — 10, Дашы хутка будзе 8, а Вадзіму і Ільі — па 7. 5 з паловай гадоў споўнілася Андрэю. Самы маленькі ў нас — Саша, яму ў студзені будзе 4. Кожны вечар амаль уся наша вялікая сям'я ў зборы. Улетку выязджаем усе разам у Мар'іну Горку, там у нас дача. Хтосьці прыходзіць новы, кагосьці забіраюць бацькі... На жаль, бывае і так, што лёс выпускнікоў складваецца трагічна. Некалькі гадоў у нас выхоўвалася Алена, сястра Аляксея. Прыгожая, вясёлая, разумная дзяўчына, якую таксама спачатку давялося вучыць многаму. Скончыла школу і паступіла ў аграрны каледж у Смілавічах. А пасля яе збіў насмерць аўтамабіль. Тады я спазнала, як жа гэта цяжка, калі бацькі хаваюць дзяцей...

У сталіцу сям'я перабралася не так даўно. У адзін дзіцячы дом сямейнага тыпу, які знаходзіцца непадалёк і адчыніўся ў 2010 годзе, пайшла працаваць добрая сяброўка Таццяны Іванаўны. А праз некаторы час яна параіла перабрацца вялікай сям'і ў Мінск. Склікалі сямейную нараду, дзе ўсё і вырашылася. І ў леташнім ліпені дзіцячы дом запрацаваў ужо ў сталіцы. Зараз штомесяц на адно дзіця выдзяляецца прыкладна каля мільёна рублёў. Вядома, хацелася б больш — але што ёсць.

— Наш дзіцячы дом — сямейны ў поўным сэнсе гэтага слова. У нас выхоўваюцца па два браты з двух розных сем'яў. Як жа ж было пакінуць іх без родных? Была ў адных братоў яшчэ і сястра, але з ёй проста не склаліся адносіны, — успамінае Таццяна Журык. — Яна прабыла ў нас з мінулага лістапада да сярэдзіны верасня.

Трохі больш за год быў у нас хлопчык, тата якога пасля ўстанавіў бацькоўства і забраў малога да сябе. А потым праз працяглы час мы выпадкова сустрэліся, і малы пазнаў мяне. Кінуўся з крыкам «Цёця Таня!» *(смяецца)*.

## «ТАК СКЛАЛАСЯ, ШТО Ў НАС УСЁ АГУЛЬНАЕ»

Нязменны атрыбут школьнага жыцця — бацькоўскі сход. І калі ў сям'і больш за два вучні, то даводзіцца выбіраць, куды неабходна схадзіць, а дзе можна і пачакаць крыху. Таццяна Іванаўна працягвае:

— З бацькоўскімі сходамі асобная гісторыя. Не ведаю чаму, але часта здараецца так, што сходы пачынаюцца ў адзін дзень і амаль у адзін і той жа час. А ў мяне чатыры вучні, і ўсе ў розных класах. Таму імкнуся вырашыць надзённыя пытанні ў прыватным парадку.

Што цікава — сярод дзяцей вельмі рэдка былі спрэчкі наконт «гэта маё, а гэта тваё». Так склалася, што ў нас усё агульнае. Зразумела, што пакуль дзеці, якіх мы ўзялі раней, прыстасоўваюцца да новых, пачынаецца дзяльба ўсяго. Што робім? Складваем усе рэчы ў агульную кучу, і іх пачынае дзяліць маці. Непаслухмянасць — гэта ўласцівасць амаль кожнага дзіцяці. І тут задача бацькоў — спакойна пераканаць малога, што неабходна рабіць так, як трэба, а не так, як ён хоча.

Сапраўдны гарэза — Андрэй. Прыйшоў да мяне ў панядзелак і кажа: «Мама, а мне ў садку верш не далі». Я кажу: «Андрэй, а давай падумаем разам, чаму ж табе не далі верш?» А тут з садка прыйшла навіна пра тое, што ён паламаў там цацкі. Выхавацелька так і кажа: «Разумееце, ён вельмі прыгожы хлопчык. І ў яго такія вялікія вочы... І калі ён глядзіць сваім анёльскім позіркам, цяжка яго, напрыклад, паставіць у кут. Нават калі ён за спінай ламае машынку...» Я зрабіла вось што: загадала Андрэю аднесці ў садок машынку, з якой ён гуляе дома. І праз некаторы час гэта дало свае вынікі.

Няма дрэнных дзяцей, няма непераадольных абставін, бо ўсё залежыць ад бацькоў. Перайначаныя словы капітана Врунгеля вельмі трапна падыходзяць да любой сям'і. І нешта падказвае, што выпускнікі сямейнага дзіцячага дома атрымаюць выдатную пуцёўку ў нялёгкае дарослае жыццё. Бо ім дапамагаюць прыстасавацца да яго з маленства.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Інфармбюро

### ВОСЕНЬ НАТХНЯЕ

**У адным са старэйшых на тэрыторыі былога СССР віцебскім фестывалі-свяце аўтарскай песні «Віцебскі лістапад», якому летась споўнілася чвэрць стагоддзя, сёлета возьмуць удзел аўтары-выканаўцы і музыканты з усёй Беларусі, а таксама з Расіі і Германіі.**

— Не адыходзячы ад сваіх традыцый, «Віцебскі лістапад—2012» аб'яўляе новы конкурс аўтарскай песні. Да ўдзелу запрашаюцца аўтары, выканаўцы, дуэты, ансамблі прадстаўленага жанру, для якіх творчасць — не пусты гук, а выдатная мелодыя, якім ёсць чым падзяліцца і чым уразіць віцебскіх меламанаў, — расказалі ў Цэнтры культуры «Віцебск». — Прыём заявак на ўдзел у конкурсе ажыццяўляецца да 25 кастрычніка ўключна ў Цэнтры культуры «Віцебск» (вуліца Маякоўскага, 1, каб. 14). Узор заяўкі можна знайсці на сайце www.gck.by.

Праграма конкурсу складаецца з двух этапаў. 27 кастрычніка ў Цэнтры культуры «Віцебск» пройдзе закрытае праслухоўванне, па выніках якога будуць адабраны лепшыя ўдзельнікі. Апошнія і ўступяць у творчую барацьбу за званне лаўрэатаў фестывалю. У гэты ж дзень адбудзецца конкурсны канцэрт «Восеньскі круіз». Падчас канцэрта ўдзельнікаў будуць ацэньваць не толькі кампетэнтнае журы, але і гледачы, якія абяруць свайго «любімчыка». Яму дастанецца прыз глядацкіх сімпатый.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### КАРЫ ХЕЙКІЛЯ ПАКІДАЕ МІНСКАЕ «ДЫНАМА», МАРЭК СІКОРА ВЯРТАЕЦЦА Ў БЕЛАРУСКУЮ СТАЛІЦУ

Галоўны трэнер мінскага «Дынама» Кары Хейкіля вызвалены ад пасады, паведамляе БЕЛТА. Як інфармуе афіцыйны сайт ХК «Дынама-Мінск», такое рашэнне прынята ўчора на пазапланавым пасяджэнні назіральнага савета сталічнага клуба.

На пасяджэнні прысутнічалі старшыня савета Юрый Бародзіч, памочнік Прэзідэнта Беларусі па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму, першы віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Ігар Зайчкоў, міністр спорту і турызму Алег Качан, старшыня федэрацыі хакея Яўген Ворсін.



Для абмеркавання пытанняў парадку дня пасяджэння былі запрошаны генеральны дырэктар клуба Аляксей Торбін, спартыўны дырэктар Ігар Матушкін, намеснік генеральнага дырэктара Аляксандр Мушта, а таксама прадстаўнікі трэнерскага штаба Аляксандр Андрыеўскі і Яўген Папіхін.

Члены савета прызналі вынікі стартавага адрэзка рэгулярнага чэмпіянату КХЛ нездавальняючымі. Былі заслуханыя Ігар Матушкін, Аляксандр Андрыеўскі і Яўген Папіхін. У выніку прыйшлі да меркавання, што бягучая сітуацыя па кіраванні камандай патрабуе неадкладнага рэагавання.

Па выніках абмеркавання назіральны савет зацвердзіў унесенае кіраўніцтвам ХК «Дынама-Мінск» рашэнне аб адстаўцы галоўнага трэнера Кары Хэйкіля ў сувязі з нездавальняючымі вынікамі, паказанымі камандай. Савет падзякаваў фінскаму спецыялісту за сумесную працу.

Выконваць абавязкі галоўнага трэнера пакуль будзе Аляксандр Андрыеўскі. Яго асістэнтам будзе Яўген Папіхін. Канчатковае рашэнне па кандыдатуры галоўнага трэнера будзе прынята ў лістападаўскім перапынку чэмпіянату КХЛ.

Таксама ў бліжэйшы час у Мінск прыбудзе галоўны трэнер мінскага «Дынама» двух папярэдніх сезонаў чэх Марэк Сікора, на якога плануецца ўскласці кансультатыўныя функцыі ў абноўленым трэнерскім штабе




# «УСМІХАЙСЯ ЧАСЦЕЙ, МАМА!»




Да святкавання Дня маці вучні 10-11 класаў Ракаўскай сярэдняй школы падрыхтаваліся сёлета вельмі незвычайна — раніцай хлопцы і дзяўчаты выйшлі на вуліцы свайго роднага горада з плакатамі, каб павіншаваць усіх жанчын з надыходзячым святам. Яркія, кідкія (а галоўнае, з пяшчотнымі словамі) плакаты падымалі настрой і пешаходам, і вадзіцелям. Паводле слоў педагога-арганізатара Ірыны Магалы, менавіта вучні сталі галоўнымі ініцыятарамі вось такой своеасаблівай акцыі — павіншавалі ўсіх мам, а жыхароў горада запрасілі ў школу на святочны суботні канцэрт.

**Марына БЕГУНКОВА,**
**фота аўтара.**

*Ракаў.*

# ПАШТОЎКА ДЛЯ САМАЙ РОДНАЙ

**Часам мы з усмешкай успамінаем, як у дзяцінстве восеньскім днём ляцелі дадому з дзіцячага садка ці школы, трымаючы ў руцэ самаробную паштоўку, хацелі хутчэй падараваць яе сваёй любімай маці. Жыццё ідзе, шмат чаго змяняецца, мы расцём, але ўспаміны пра хэнд-мэйд паштоўкі засталіся назаўсёды з намі і ў сэрцах нашых мам.**

## Кастрычніцкая традыцыя

Пачатак кастрычніка ў дзіцячых садках заўсёды прысвечаны падрыхтоўцы да Дня маці. Дзяцей з маленства вучаць шанаваць сваіх мам, не забываць віншаваць іх з гэтым святам. Выхавальніцы дапамагаюць дзеткам маляваць фарбамі кветкі, прыклейваць да кардону кляновыя лісточкі — усё гэта абавязкова ператворыцца ў цудоўную віншавальную паштоўку для маці.

У дзіцячым садку №547 горада Мінска цэлы тыдзень ідзе падрыхтоўка да свята. Дзеці разам з выхавальніцамі рыхтуюць канцэрт для сваіх мам. Паштоўка ў гэтым годзе аб'яднана з запрашэннем на канцэрт. Маленькімі ручкамі дзеці старанна выразаюць кветкі з каляровай бумагі, прыклейваюць іх да кардонных прамавугольнікаў. Увечары малыя прынясуць свае паштовачкі дадому.



— Я лічу, што традыцыя віншаваць мам хэнд-мэйд паштоўкамі цудоўная, таму кожны год я надаю шмат увагі ў групе стварэнню такога падарунка, — дзеліцца сваім вопытам выхавальніца дзіцячага садка №547 Яўгенія Шчурэвіч. — Сама ж, на жаль, я не раблю рукамі паштовак сваёй маці, часцей купляю ў краме, дару кветкі.

## Кожны дзень — дзень маці

У вялікай па сённяшніх мерках сям'і Вольгі Пратасевіч у нядзелю таксама будзе свята: сямейны абед, любімы ўсёй сям'ёй яблычны пірог. Вольга — маці чатырох



дзяцей, двух хлопчыкаў і дзвюх дзяўчынак. Хлопцы ўжо дарослыя, жывуць асобна, маюць свае сем'і, а дзяўчынкі з мамай жывуць заўсёды: у іх сіндром Даўна. Вера нарадзілася дваццаць шэсць гадоў таму, Наташу сям'я Пратасевіч вырашыла ўдачарыць у 2003 годзе. Дзяўчынкі сябруюць між сабой, абедзве — творчыя натуры. «Раней сітуацыя з такімі дзеткамі была зусім іншай: не было цэнтраў дзённага знаходжання, стасункаў іх між сабой, а мне трэба было ісці на працу, таму Веру прыходзілася часта пакідаць адну, — расказвае Вольга, — мая дачурка навучылася сама сябе займаць. І гэтым заняткам, на маё шчасце, стала маляванне». Дзяўчына малюе да дваццаці цікавых карцін у дзень. Наташа вельмі любіць танцаваць: «Я не ведаю яшчэ адну такую цудоўную танцорку», — з усмешкай на твары кажа мама Вольга. Агульны інтарэс у дзяўчынак — вышыванне. Спачатку пяльцы і канву купілі Веры, Наташа пранікласа цікавым хобі сястры і таксама захацела навучыцца ствараць вышыўкі. Цяпер яна штодня здымае з пяльцаў свае работы. Для Вольгі кожны дзень — дзень маці: дзяўчаты дораць ёй свае, вышыўкі, малюнкі, сціскаюць у моцныя абдымкі і падоўгу не хочуць адпускаць. Падарункі дзяўчат у нядзелю, іх усмешкі — самыя лепшыя паштоўкі для мамы Вольгі ў яе свята.

## «Ёй лілеі падабаюцца, вось іх і буду дарыць»

Таццяна Дрэка пра свята маці не забывае. Дзяўчына працуе ў школе, сваім вучням абавязкова нагадае павіншаваць мам з іх днём. Сама ж традыцыю рабіць паштоўку сваімі рукамі памятае толькі з дзяцінства. Кажа, што ў дзіцячым садку яна прыклейвала прыродны матэрыял да кардону або малявала прыгожыя кветкі, пасля гэтага дзяўчынка сваёй дзіцячай ручкай старанна выводзіла «Віншую...». Зараз на гэта ў Таццяны няма часу, але сваю маму віншаваць яна будзе абавязкова:

— Хачу купіць самую прыгожую паштоўку і, безумоўна, кветкі. Ёй лілеі падабаюцца, вось іх і буду дарыць. Я родам з Пінска, там жа жыве мая мамачка. У суботу паеду дадому, а ў нядзелю буду віншаваць сваю дарагую матулю.



Для некаторых дарослых дзяцей паштоўкі ды кветкі часам адыходзяць на другі план, важнейшай за ўсё становіцца праца і іншыя справы — мам сваіх яны віншуюць па тэлефоне. За гэтым губляецца цеплыня і пяшчота, якую можна падарыць маці разам з паштоўкай. І, безумоўна, чароўная матуліна ўсмешка, якую мы атрымліваем у адказ.

**Любоў БЯЛЯЕВА.**
**Фота аўтара.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 33 (163)

■ Фестывалі

# МУЗЫКАНТАЎ ПА ВОСЕНІ ЛІЧАЦЬ

## Беларускія зоркі музыкі ўпершыню з'едуцца на форум «Беларусы свету»

Яны могуць жыць сёння ў самых розных краінах: Беларусі і ЗША, у Германіі, Францыі, Грэцыі і Расіі. Але дзе б ні было запатрабавана іх майстэрства, яны ўсё роўна застаюцца выхаванцамі і носьбітамі беларускай культуры. А тут у нашай культуры свята — 75-годдзе Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Свята для тых, хто жыве ў Беларусі, і для тых, хто стварае ёй гонар сваім майстэрствам за межамі. Вядома, у юбілейны год на галоўным філарманічным фестывалі «Беларуская музычная восень» павінна быць магчымасць паслухаць усе лепшыя нашы сілы. Але сярод гасцей фестывалю і калектывы з Італіі, ЗША, Германіі, Літвы і шмат якіх краін.

— Музыканты з 15 краін, нашы суайчыннікі, выхаванцы прыязджаюць для таго, каб прадэманстраваць, колькі талентаў розных пакаленняў мы за гэты час падрыхтавалі. 16 канцэртаў з фестывальнай праграмы пройдзе ў рамках форуму. 31 канцэрт (у вялікай і малой залах) будзе прысвечаны Беларускай дзяржаўнай філармоніі, — адзначае **мастацкі кіраўнік Белдзяржфілармоніі Юрый ГІЛЬДЗЮК.** — Мы вырашылі паказаць лепшае ў гонар 75-годдзя Беларускай філармоніі і 80-годдзя Акадэміі музыкі. Адно ад другога мы не аддзяляем, таму што першы выпуск Акадэміі музыкі стаў падмуркам стварэння Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў 1937 годзе. Таму абавязкова выступяць і ўсе нашы лепшыя калектывы і музыканты.

Выступяць на радзіме выдатныя піяністы Андрэй Паначэўны, Андрэй Сікорскі, Юрый Бліноў. Цудоўны скрыпач Арцём Шышкоў — гэта зорка, якая таксама ззяе нам здалёк. Але пры гэтым усе музыканты заўсёды гатовыя сагравацць сваім майстэрствам на радзіме. Скрыпач Сцяпан Яковіч яшчэ нядаўна выходзіў на сцэну ў складзе аркестра Юрыя Башмета «Салісты Масквы», але аб'ездзіўшы ўвесь свет з калектывам, цяпер наш зямляк стаў выступаць асобна. Беларуска-бельгійскім трубачом называюць сёння Андрэя Кавалінскага. Беларускім цымбалам прысвечаны цэлы канцэрт «Віртуозы цымбал», у якім выступяць лепшыя беларускія выканаўцы, сярод якіх Ларыса Рыдлеўская, Галіна Лазовік, Аляксандра Дзенісеня, Вераніка Прадзед і іншыя. Майстэрствам беларускіх цымбалістаў сёння захапляюцца ў свеце: Ангеліна Ткачова цяпер жыве ў Грэцыі. Адмыслова для яе напісаў твор кампазітар Георг Хатзіміхелакіс, аўтар гімна Афінскай Алімпіяды (у нас будзе магчымасць паслухаць яго падчас фестывалю). А Міхаіл Лявончык адзначае, што на яго цымбалах стаяць адмысловыя беларускія струны. Як яны гучаць — можна будзе паслухаць падчас выканання Канцэрта для цымбалаў з аркестрам Уладзіміра Кур'яна.

«Беларуская восень» — гэта і беларуская музыка. З яе фестываль пачнецца 14 кастрычніка: так супала, што аднагодкам філармоніі з'яўляецца выдатны кампазітар Дзмітрый Смольскі. На адкрыцці фестывалю прагучыць яго музыка, і нават прэм'ера 15-й сімфоніі.

— Для мяне знаёмства з кожным сучасным кампазітарам — значная падзея, — распавядае **заслужаны артыст Расіі Яўген БУШКОЎ,** які будзе дырыжыраваць гэтым творам. — Для мяне сустрэча з Дзмітрыем Браніслававічам і яго музыкай — вялікая падзея. Прэм'ерная сімфонія — неверагодна смелая рэч. Смелая і захапляльная. Я ўзгадаў словы песень аднаго перыяду, якія з шастаковічаўскім гумарам і вастрынёй цытуюцца ў сімфоніі — піянерскія, камсамольскія... Але яны гучаць сёння па-іншаму, чым тады, калі іх спявалі піянеры са светлымі тварамі. Я атрымаў задавальненне, працуючы з гэтым творам.

### СУМ З УСМЕШКАЙ



*Кампазітар Дзмітрый Смольскі пра 15-ю сімфонію, прэм'ера якой адбудзецца 14 кастрычніка:*

**— Яна пра тую эпоху, у якой я пражыў жыццё. Моладзь, можа, не ведае той краіны, у якой так вольна было дыхаць чалавеку. Я паспрабаваў паказаць яе праз музыку. Калі б я пісаў гэтую сімфонію 20 ці 25 гадоў таму, калі я адным з першых у Беларусі падаваў заяву аб выхадзе з КПСС, то, можа быць, па-іншаму напісаў. Але цяпер, праз некаторы час, я стаў больш сталым, больш ураўнаважаным. Таму 15-ю сімфонію я пісаў з добрым пачаткам. Можа, толькі ў першай частцы згушчаны фарбы, таму што там ціхай сапай у краіну пранікае прывід камунізму. Астатнія тры часткі — светлыя, ўспамін пра тую эпоху, а не агрэсія. Я ўсё сваё жыццё пражыў у Мінску і вельмі цудоўна разумею, што ў нас моцныя традыцыі ідэалогіі сацыялізму, захавана ўся сімволіка, атрыбуты, назвы вуліц. Напэўна, гэтым таксама тлумачыцца мой лірычны ўспамін пра той час, таму рэфрэнам паўтараецца мелодыя «как хорошо в стране советской жить»... Але гэта — сум з усмешкай.**

Айчынныя кампазітары сёння будуць мець аўтарскія канцэрты на «Беларускай музычнай восені»: у праграме творчыя вечары Віктара Войціка, Віктара Капыцько, Уладзіміра Карызны, якому споўнілася 50 гадоў, але гэта будзе яго першы аўтарскі вечар у філармоніі. У канцэрце прымуць удзел дзеці кампазітара — лаўрэаты міжнародных конкурсаў Анастасія Карызна (скрыпка) і Іван Карызна (віяланчэль).

Музыка гэтай восені — самая розная: ад сусветнай класікі да беларускай песні. Але галоўнае, што беларускія кампазітары і музыканты прадэманструюць узровень айчыннага музычнага мастацтва.

— «Беларуская музычная восень» уяўляе сабой як ніколі грандыёзны форум мастацтваў, — падкрэсліў **Міхаіл КАЗЛОВІЧ, начальнік упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Беларусі.** — Праект «Беларусы свету» ўпрыгожыў юбілей філармоніі. Невыпадкова гэты праект уключаны ў фестываль, таму што таленавітыя музыканты, якія зараз працуюць у розных краінах, пачыналі свой шлях на сцэне беларускай філармоніі, якая садзейнічала раскрыццю іх сіл. У гэтым праекце — сінтэз беларускай нацыянальнай культуры. Важна, каб беларускія музыканты, якія вядуць актыўную творчую дзейнасць за мяжой, не толькі прыязджалі сюды, але і пазіцыянавалі сябе беларусамі, выступалі як частка айчыннай культуры.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

### «САЛОДКАГАЛОСАЯ ПТУШКА...»

**Заслужаная артыстка Беларусі Ганна Маланкіна адзначыла 25-годдзе творчай дзейнасці выкананнем ролі ў спектаклі «Салодкагалосая птушка... з чалавечым голасам». Прэм'ера адбылася на пачатку кастрычніка ў Нацыянальным драматычным тэатры імя Горкага. Менавіта ў гэтым тэатры артыстка працуе з верасня 1987 года.**

Спектакль ўласна і пастаўлены на Ганну Маланкіну — у ім толькі два галоўныя героі. Актрыса, зорка кіно, збягае ад розгаласу пасля прэм'еры фільма, які, на яе думку, чакае правал. Прачнуўшыся аднойчы ў нейкім правінцыйным гатэлі, яна знаходзіць у сваім нумары маладога чалавека, які хоча скарыстацца знаёмствам з ёй, каб вырашыць пытанні ўласнага жыцця — кахання, поспеху. Рэжысёр Аляксандр Карпаў, які вядомы сваімі працамі ў кіно, вырашыў паставіць спектакль у тэатры — адчуваецца, менавіта для гэтай актрысы. І хацеў даць магчымасць паказаць сябе адразу... у некалькіх ролях. Для гэтага сумясціў п'есу Тэнесі Уільямса з п'есай Жана Както, паказаўшы, як зорка кіно ў гэтым кіно здымаецца... Заадно ёсць нагода паразважаць — ці сапраўды гэтая Прынцэса выдатная актрыса, ці, можа, нездарма яе адольваюць сумненні ва ўласным таленце і зорнасці? Наогул, што ёсць тая самая зорнасць — у вачах іншых і ва ўласных вачах?..

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ЧАМУ ЗДЫМАЦЬ ФІЛЬМЫ ЕДУЦЬ У БЕЛАРУСЬ

## альбо Як кінааператар з 40-гадовым стажам расказваў, што ідэалізаваць вясковы побыт неактуальна

**Ён сябраваў з Алесем Адамовічам, здымаў Васіля Быкава; пакуль працаваў з Кірай Муратавай, схуднеў на 10 кілаграмаў і наогул застаўся ў кіно толькі дзякуючы кампазітару Альфрэду Шнітке. Калі вы глядзелі стужку Элема Клімава «Ідзі і глядзі», знятую на кінастудыі «Беларусьфільм» у 1984 годзе, вы разумееце, пра каго ідзе гаворка.**

Кінааператар Аляксей РАДЗІВОНАЎ амаль праз 30 гадоў пасля здымак «Ідзі і глядзі», паводле сцэнарыя Алеся Адамовіча наведаў Беларусь. Беларускі акцёр і рэжысёр Дзмітрый Іосіфаў (вядомы па ролі Бураціна) здымае тут 8-серыйны фільм «Бягучы радок» для расійскага тэлеканала, на які Радзівонава запрасілі аператарам. Прафесіянал з больш чым 40-гадовым стажам расказаў «Звяздзе», чаму ў Беларусь едуць кіношнікі і як Алесь Адамовіч дапамагаў падчас здымак «Ідзі і глядзі».

### Краіна белых людзей

**— Чаму расіяне прыязджаюць здымаць у Мінск?**

— Таму што ўсе ў Мінску. Таму што быццам бы танней. У чым я, шчыра кажучы, не ўпэўнены. Але я чуў, што за сезон у Беларусі часам здымаецца больш за 20 праектаў. Яшчэ важная прычына — пошук духу савецкай эпохі. Зараз жа безліч сцэнарыяў пра 1970-1980-я гады. Таму што пра сучаснасць здымаць надакучыла. Ды і сцэнарый пра сучаснасць напісаць складаней.

**— Дзе вы здымаеце ў Беларусі?**

— Дзе што засталося: у Мінску, у раёне Смалявіч, ездзілі ў Беразіно.

**— Што пра саміх беларусаў думаеце?**

— Людзі тут, як і паўсюль, розныя. Агульная ацэнка ў любым разе будзе гучаць прымітыўна. Але калі ўзяць асноўныя тэндэнцыі і параўнаць з Масквой, то першае, што кідаецца ў вочы — адсутнасць агрэсіўнасці. Беларусь — краіна светлых людзей. На вуліцах — ветлівасць, дабрадушнасць. Вуліцы чыстыя.

### 100-працэнтнае беларускае кіно

**— Беларусы лічаць карціну Клімава «Ідзі і глядзі» беларускай, хоць рэжысёр — рускі. Мы ганарымся гэтым фільмам. Але многія ставяцца скептычна, маўляў, які ж ён беларускі! Як вы лічыце, гэта беларуская стужка?**

— Безумоўна, беларуская! Па-першае, аўтар сцэнарыя — беларускі пісьменнік. Алесь Адамовіч тут — самае моцнае звяно. І калі б не было такога сцэнарыя, не было б такога водгуку на гэтую карціну. Па-другое, гаворка там ідзе пра Беларусь у час вайны, пра беларускіх людзей. Наогул, лічу, што гаварыць пра нацыянальнае паходжанне карціны можна адносна таго, хто вытворца. Можна яшчэ вызначаць па нацыянальнасці, месцы нараджэння аўтара. Алесь Адамовіч — беларус. Хоць ён быў чалавекам па-сапраўднаму шырокіх поглядаў на свет. Яго цалкам можна назваць інтэрнацыянальным аўтарам. У яго ніколі не было нейкіх абмежаванняў з пункту гледжання нацыянальнага элемента. Ён быў вышэй за гэта. Гэта маё асабістае меркаванне — я даволі шмат сутыкаўся з Алесем.



Стэфанія Станюта ў фільме Э. Клімава «Развітанне» (1981).

**— Вядома, што падчас працы над «Ідзі і глядзі» Алесь Адамовіч даволі шчыльна кантактаваў са здымачнай групай...**

— Так, ён вельмі часта бываў на здымках, шмат дапамагаў. У першую чаргу з пункту гледжання кантактавання з мясцовым партыйным кіраўніцтвам, таму што там былі пытанні. І проста дапамагаў як кансультант: падказваў многія дэталі, яго расказы пра вайну, партызанскі побыт вельмі шмат далі для атмасферы фільма. Чалавекам ён быў неканфліктным. У яго было неверагоднае ўменне кантактаваць з абсалютна рознымі людзьмі, не ўступаючы ў канфлікт, але адстойваючы сваю пазіцыю, зусім не ідучы на кампрамісы. Дакладней, кампрамісы заўжды ёсць у жыцці, але Алесь ніколі не саступаў у галоўным.

**— Чым яшчэ дапамагаў Алесь Адамовіч?**

— Ён прыязджаў на некалькі дзён запар на здымкі, мы кантактавалі, у падрыхтоўчым перыядзе ўдзельнічаў. Разумееце, асабістыя стасункі ў кіно ды і ў жыцці наогул — гэта самае галоўнае, самае дарагое. Прывяду прыклад. Я лічу, што самае каштоўнае ўзаемадзеянне з рэжысёрам, якое ў мяне было, — з Аляксандрам Кайданоўскім. Гэтага дасягнуць вельмі няпроста. Трэба сысціся з чалавекам на нейкім ментальным узроўні. Калі мы працавалі над карцінай «Жонка прадаўца газы» ў экспедыцыі ў Кёнігсбергу, мы літаральна па 18 гадзін у суткі былі разам. Размаўлялі пра самыя розныя рэчы. І з пастаянных размоў неяк самі сабой знаходзіліся рашэнні для фільма. Напэўна, у такой жа ступені ў нас было ўзаемаразуменне з Алесем Міхайлавічам.

### Нястрашнае балота

**— А дзе здымалі «Ідзі і глядзі»? Ці былі нейкія небяспечныя моманты падчас здымак?**

— Здымалі пад Смалявічамі, шмат у Бярэзінскім запаведніку. Пад Оршай здымалі эпізод з балотам. Вось цікавая рэч: усе гавораць, якая жудасць гэтае балота. У фільме гэта адна з самых цьмяных сцэн, рэжысёр гэтага і дабіваўся. Але здымкі былі абсалютна камфортныя. Насамрэч, у сапраўднае балота залезці — вельмі небяспечна. А тое была закінутая торфараспрацоўка. За 20 гадоў там утварылася балота. Але з-за таго, што торф здабывала машына, дно было абсалютна роўнае, цвёрды грунт. І гэта рабіла здымкі цалкам бяспечнымі.

**— А пра што разважаў Алесь Адамовіч, калі вы з ім кантактавалі? Што гаварыў пра Беларусь, вайну?..**

— Яго вызначальная рыса была ў шырыні поглядаў. Ён усё бачыў як бы ў гістарычнай перспектыве. І ў той жа самы час вельмі палюдску адчуваў. Такое рэдкае спалучэнне. Шырокі погляд на ўсё, але ніколі — абстрактны. Дарэчы, у яго творах гэта і адчуваецца. У яго ўсё даволі дакладна па перадачы матэрыяльнасці. Няма абстракцыі, але тэмы глабальныя. У камунікацыі ён быў такі ж. Не было абсалютна ніякага бар'ера, нават нягледзячы на тое, што ён займаў даволі высокія пасады. Мяне гэта наогул ніколі не хвалявала, таму што яго званні і рэгаліі не былі заўважныя, ён імі не хваліўся. У яго не было, як гэта сёння кажуць, ніякай «зорнасці». Яшчэ ў Алеся была такая цікавая рыса — ён быў па-за сваім узростам. У большасці людзей узрост моцна ўздзейнічае на адчуванне свету, неяк фіксуецца ў свядомасці. Яго свядомасць не была ніяк звязана з яго ўзростам. Алесю ўдавалася заставацца ментальна маладым чалавекам.

**— Што было характэрна для Алеся Міхайлавіча на здымачнай пляцоўцы? Мо ён шмат паліў, напрыклад, або чытаў?..**

— Тады ён ужо кінуў паліць, таму што пачаліся праблемы са здароўем... Неяк мяне здзівіў такі эпізод. Алесь не быў фізічна надта здаровым чалавекам. Але вельмі шмат з намі хадзіў. У сцэнарыі «Ідзі і глядзі» быў вялікі заключны эпізод (мы, дарэчы, яго так і не знялі — напэўна, да лепшага), такі сімвалічны. Вакол лесу ішоў бой, па кругу. Ну, вы разумееце, такі вобраз бясконцай бессэнсоўнасці вайны. Для гэтага эпізоду мы знайшлі месца недалёка ад Хатыні — былыя торфараспрацоўкі і кавалачак лесу. Я памятаю, як мы пешкі топалі па гэтым чорным торфе. Некалькі разоў абышлі лес. Карацей, даволі няпросты быў шпацыр. І Алесь з намі хадзіў. Прычым я памятаю, у яго былі такія цывільныя туфлі, зусім не для падарожжаў. І вось такі цывільна апрануты чалавек прайшоў з намі па тарфяных лясах прыстойную адлегласць. Ён відавочна вельмі стаміўся, але не скардзіўся. Ён наогул ніколі ні на што не скардзіўся, выпраменьваў увесь час нейкі пазітыў. Пры ўсім яго разуменні ўсіх праблем гэтага свету, канкрэтнага жыцця, савецкай улады ён заўжды быў вельмі пазітыўным чалавекам. Чаго, дарэчы, не было ў Васіля Быкава. У яго было вельмі змрочнае ўспрыманне рэчаіснасці.

**— А вы сябравалі з Быкавым?**

— Не, я сутыкаўся з ім аднойчы, калі Элем Клімаў пасля гібелі Ларысы Шэпіцькі рабіў пра яе невялікі дакументальны фільм «Ларыса». Туды ўваходзілі інтэрв'ю. І ў прыватнасці, з Васілём Быкавым у Мінску. Я быў аператарам гэтай карціны. Асабістых кантактаў з Быкавым у мяне не было, але падчас здымак узнікла ўражанне, што асабіста з ім кантактаваць, напэўна, было вельмі няпроста. Людзі розныя бываюць...

### Развітанне з вёскай

**— Аляксей Барысавіч, вы здымалі яшчэ адзін фільм, які ўскосна тычыцца Беларусі. У «Развітанні» (1981) Элема Клімава здымалася выдатная беларуская актрыса Стэфанія Станюта...**

— А вы глядзелі «Развітанне»? Дзе вы яго адкапалі?

**— У інтэрнэце.**

— А ў мяне, дарэчы, няма гэтага фільма.

**— Неверагодны фільм, вельмі моцна ўздзейнічае! І музыка Шнітке там настолькі да месца!**

— Праўда? А па-мойму, фільм троху зацягнуты...

**— Вам не падабаецца?..**

— Ды не. Проста зараз для мяне сталі відавочнымі некаторыя яго заганы. Я, шчыра кажучы, астыў да прозы Распуціна. Ён нейкі застылы ў сваіх поглядах. Нашто ідэалізаваць вясковы побыт сёння? Жыццё мяняецца. Там пафасу занадта шмат.

**— А я не ўспрыняла фільм як ідэалізацыю вясковага побыту. Мне здаецца, там мастацкае абагульненне пра тое, як балюча адбываецца змена поглядаў, пакаленняў, ладу жыцця....**

Кінааператар Аляксей РАДЗІВОНАЎ *(у цэнтры)*.



— Так. Думаю, яно так успрымаецца, таму што фільм пераадолеў нейкія архаічныя моманты, якія прысутнічаюць у самой аповесці... А наконт Шнітке — яму я наогул, можна сказаць, абавязаны тым, што застаўся ў прафесіі. Усё было вось як. Першапачаткова меркавалася, што эпізод прыбірання хаты перад спаленнем у «Развітанні» будзе здымацца ў рэальнай хаце. Але ў сезон эпізод зняць не паспелі, прыйшла зіма, і давялося пераносіць хату ў павільён. Было пытанне — пакідаць столь ці не. Абсурд, вядома, — хата без столі. Калі ў жыцці святло трапляе ў хату праз вокны, то і ў фільме павінна. Але мы сталі здымаць без столі, падсвечвалі зверху. Памятаю, як прыходзілі галоўныя інжынеры, казалі, што так нельга... Карацей, калі матэрыял знялі, у Клімава таксама з'явіліся нейкія пярэчанні. Ён вырашыў паказаць гэта Шнітке, маўляў, як ён лічыць — добра гэта ці дрэнна. Шнітке сказаў, што так і трэба здымаць. Пасля гэтага ўсе сумневы адпалі.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**


### Извещение о проведении 12 ноября 2012 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Гроднооптторг»

| № лота | Предмет торгов (наименование, характеристика) | Цена за 1 штуку с учетом НДС, руб. | Количество (штук) | Сумма задатка за 1 штуку, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Балясина №1 массой 9 кг, изготовленная из арматурной стали | 107 976 | 4 476 | 10 798 |
| 2. | Балясина №2 масса 13 кг, изготовленная из арматурной стали | 147 012 | 3 086 | 14 701 |
| 3. | Балясина №1-1 масса 10 кг, изготовленная из арматурной стали | 117 012 | 5 512 | 11 701 |
| 4. | Балясина №2-1 масса 11 кг, изготовленная из арматурной стали | 131 844 | 1 501 | 13 184 |
| 5. | Балясина №2-2 масса 8 кг, изготовленная из арматурной стали | 94 848 | 893 | 9 485 |
| 6. | Балясина №1-2 масса 10 кг, изготовленная из арматурной стали | 116 748 | 1 648 | 11 675 |
| Местонахождение продаваемого имущества | г. Гродно, ст. Лососно | | | |
| Сведения о продавце | ОАО «Гроднооптторг», 230001, г. Гродно, ст. Лососно, телефоны: (0152)52-44-95, (044)566-00-53, (0152)52-46-01 | | | |
| Сведения об организаторе аукциона | Управляющий по делу о банкротстве ОАО «Гроднооптторг» ООО «Топ Бизнес Альянс», телефоны: (0152)52-44-95, (044)566-00-53, (0152)52-46-01 | | | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, индивидуального предпринимателя; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок по 08.11.2012 включительно на расчетный счет № 3012127410010, в Региональной Дирекции № 400 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Гродно, код 153001369, получатель – ОАО «Гроднооптторг» УНП 500013881.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление от единственного участника, предмет торгов продается единственному частнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи.

**Аукцион состоится 12 ноября 2012 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ст. Лососно, актовый зал. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 15.10.2012 по 08.11.2012 включительно в рабочие дни с 09.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ст. Лососно (административное здание).**

Ознакомление с предметом торгов осуществляется по предварительному согласованию с продавцом.

Телефоны для справок: (0152)52-44-95, (044)566-00-53, (0152)52-46-01. Сайт в интернете**:www.opttorg.grodno.by**



### Извещение о проведении 14 ноября 2012 года торгов по продаже имущества ОАО «Белпромтара»

| Номер предмета торгов | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| Наименование и характеристики продаваемого имущества | - здания цеха ширпотреба (цех ширпотреба, инв. номер 110/С-87292, общая площадь – 386,1 кв. м; - здание участка переработки дерева, инв. номер 110/С-91783, общая площадь – 559,1 кв. м; здание механического цеха, инв. номер 110/С-91788, общая площадь – 337,3 кв. м); - теплица, инв. номер 110/С-87267, общая площадь – 140,8 кв. м; - зеленые насаждения (деревья – 57 шт., кустарник – 1 шт., газон площадью 3 393,8 кв. м). | - здание производственное общей площадью 104,3 кв. м (здание специализированное иного назначения, инв. номер 110/С-91789); - буфет общей площадью 157,2 кв. м (здание специализированное розничной торговли, инв. номер 110/С-87252); - гараж общей площадью 22,3 кв. м (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции)), инв. номер 110/С-94176); - котельная общей площадью 263,3 кв. м (здание специализированное иного назначения, инв. номер 110/С-87257); - биллиардная общей площадью 57,7 кв. м (здание специализированное иного назначения, инв. номер 110/С-87265); - административно-бытовое здание общей площадью 119 кв. м (здание административно-хозяйственное, инв. номер 110/С-87279); - красный уголок общей площадью 136,5 кв. м (здание специализированное иного назначения, инв. номер 110/С-87291); - склад топлива общей площадью 288,1 кв. м (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 110/С-87273); - туалет (площадь застройки 4,55 кв. м, инв. номер бухг. 710); - забор железобетонный общей площадью ограждения 152,75 кв. м (инв. номер бухг. 70); - пожарный водоем емкостью 60 куб. м (инв. номер бухг. 71); - теплотрасса (длина сети 65 м, инв. номер бухг. 57); - водопроводная сеть (длина сети 112,5 м, инв. номер бухг. 549); - зеленые насаждения (деревья), 12 шт.; - зеленые насаждения (газоны), общая площадь 1575 кв. м; - зеленые насаждения (цветник), общая площадь 11 кв. м; - камера сушильная КС-60-РЭ (инв. номер бухг. 556); - котел паровой Е-1/9-1 (инв. номер бухг. 8). | - контора с пристройкой, инв. номер 631/С-8478, общая площадь – 104,6 кв. м; - навес хранения тары, инв. номер 631/С-8416, общая площадь 517,3 кв.м; - цех ремонта картонной тары, инв. номер 631/С-8418,общая площадь – 321,0 кв.м; - здание гаража с пристройкой, инв. номер 631/С-8419, общая площадь 149,4 кв.м; - цех тарный, инв. номер 631/С-8422, общая площадь 57,3 кв.м; - склад хранения тары, инв. номер 631/С-8424, общая площадь – 610,0 кв.м; - цех новой тары, инв. номер 631/С-8454, общая площадь 252,5 кв. м; - ленкомната, инв. номер 631/С-8459, общая площадь 61,8 кв. м; - линия электропередач, инв. номер 631/С-12634, протяженность – 179,5 м; - водоем пожарный, инв. номер 631/С-12636, объем – 8.0 куб. м, диаметр – 2,0 м, глубина – 2,5 м; - насаждения производственных площадей, инв. номер 053/09. |
| Сведения о земельном участке | Площадь – 1,2605 га, кадастровый номер 141000000007003253, назначение – обслуживание здания участка переработки дерева, цеха ширпотреба, теплицы и здания механического цеха | Площадь – 0,5212 га, кадастровый номер 141000000007003251, назначение – земельный участок для обслуживания производственной базы | Площадь – 1,0658 га, кадастровый номер 621350100007001681, назначение – обслуживание зданий и сооружений |
| Местонахождение продаваемого имущества | Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 | Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25 | Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина, д. 41 |
| Сведения о продавце | ОАО «Белпромтара», 1-ый Твердый пер., 7, 220037, г. Минск | | |
| Сведения об организаторе аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск | | |
| Начальная цена предмета торгов | 777 300 000 белорусских рублей без учета НДС | 1 631 268 000 белорусских рублей без учета НДС | 559 050 536 белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 70 000 000 белорусских рублей | 160 000 000 белорусских рублей | 55 000 000 белорусских рублей |
| Сведения об обременениях | Договор аренды от 15.12.2010 по 21.10.2013 г. № 46 (здание уч-ка переработки дерева S – 431,2 $м^2$, открытые площадки – 200 $м^2$) | | Договоры аренды от 01.06.2010 г. по 31.05.2013 г. № 41(контора с пристройкой S – 29,2 $м^2$, здание гаража S – 137,7 $м^2$, здание ленкомнаты S – 29,2 $м^2$); от 22.10.2010 г. по 21.10.2013 г. № 42 (контора с пристройкой S – 10,5 $м^2$); от 15.08.2011 г. по 14.08.2014 г. № 45 (цех новой тары S – 96,7 $м^2$) |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Белпромтара», утвержденным организатором торгов.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата вознаграждения за организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (покупателем).

**Аукцион состоится 14 ноября 2012 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 15.10.2012 по 12.11.2012 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

**Телефоны для справок: (017) 327 48 36, (017) 291 83 10, (029) 636 15 22.**



### Отказ от проведения аукционных торгов

УП «Минский городской центр недвижимости» извещает об отказе от проведения 30 октября 2012 года торгов по продаже принадлежащего ООО «Белкаспистрой» незавершенного законсервированного здания спального корпуса общей площадью 1557,9 кв.м (назначение: здание специализированное иного назначения, готовность строения – 49 процентов), инвентарный номер 600/U-75605, расположенного по адресу: Минская область, Минский район, Ждановичский с/с, район д. Заречье-1 (извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 29.09.2012).

**Телефон для справок: (017) 327 48 36.**



У суд **Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **ЧАТЫРКО Аляксандра Вячаслававіча**, 20 красавіка 1959 года нараджэння, ураджэнца в. Краснае Знамя Добрушскага раёна Гомельскай вобласці, апошняе месца жыхарства і апошняе вядомае месца яго знаходжання — Гомельская вобласць, Светлагорскі раён, в. Шупейкі, вул. Новая, д. 50.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Чатырко Аляксандра Вячаслававіча, паведаміць іх суду Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў на адрас: Гомельская вобласць, г. Светлагорск, вул. Леніна, д. 82.



26 октября 2012 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «НеоТрейдЗапад».

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О переизбрании членов наблюдательного совета.
2. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета.

Собрание будет проходить по адресу: г. Гродно, пер. Дзержинского, 17.

Начало регистрации участников собрания — 13.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

*УНП 500167057.*



УП «Минский городской центр недвижимости» уведомляет о внесении следующего изменения в извещение о проведении 30 октября 2012 года торгов по продаже имущества ОАО «БЕЛКАСПИСТРОЙ», опубликованное в газете «Звязда» от 29.09.2012:

вместо «ОАО «БЕЛКАСПИСТРОЙ»»

**СЛЕДУЕТ ЧИТАТЬ «ООО «БЕЛКАСПИСТРОЙ»**

**Телефон для справок: (017)327-48-36.**

■ Хто каго?

# «НЕ СХАВАЕШСЯ АД ЖОНКІ НІ Ў СЯБРОЎ, НІ Ў МАЛАДЗЁНКІ...»



**...Аднойчы ўсе пушчанскія звяры на вялікі сход сышліся, а пасля яго, як водзіцца ў людзей, «паляну» накрылі (што важна, без жонак). Выпілі па першай чарачцы, па другой, па трэцяй наліваюць... І некаму нават слова далі... Ды тут, як на ліха, у льва, у самага галоўнага звера, мабільнік «заспяваў». Ён правую лапу ўверх — прашу, маўляў, цішыні (хоць мог бы і не прасіць: усе і без таго заціхлі... Бо (апроч іншага) цікава ж, што сам леў будзе гаварыць, і каму... Аднак той маўчыць — пераважна слухае, зрэдчас хіба слоўкі ўстаўляе. Кшталту: «Так-так, дарагая... Ну, вядома ж, дарагая...», а нарэшце і ўвогуле: «Добра, ужо іду».**

**Гэта леў «дарагой» сказаў. А ўсім іншым: «Прабачце, шаноўныя, я вас пакіну. Мяне, як вы чулі, жонка чакае». «Леў, ды ты што?! — вушам не паверыў ад дзвюх чарак асмялелы бык. — Ты ж цар усіх звяроў! Ты ж самы галоўны ў нашай пушчы! І што — не можаш сваю жонку на месца паставіць? Пазваніла, а ты, выходзіць, і хвост падціснуў? Адразу ж «слухаю» ды «іду»?.. А вось я дык нават вухам не павёў бы! Хай бы сабе клікала, хай бы казала, што чакае... Ды хоць да пасінення. Не пайшоў бы і ўсё...». «Я ведаю, чаму, — спыніў прамоўцу леў. — Таму, што цябе чакае карова, а мяне — львіца».**

Кажуць, пасля гэтых слоў цэлую хвіліну цішыня над палянай вісела. А потым — ці не кожны са звяроў уздыхнуў, ці не кожны падумаў і тую, трэцюю, чарку выпіў за тое, каб яго таксама чакала (пажадана дома) сапраўдная львіца (кожнага свая). А яшчэ, каб яна — варта нумар набраць — паводзіла сябе акурат таксама, як кабета з верхняга здымка (кінулі вочкам?). Спадарыня Века з вёскі Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна пра яе (ды што там — пра любую з жанчын) піша:

*Забыты сабачкі, да лямпачкі час,*
*Калі дазваніўся каханы да нас*
*І кажа чаканыя, любыя словы...*
*Жанчыны бясконца*
*іх слухаць гатовы!*
*Званіце ж, мужчынкі,*
*званіце не зрэдку:*
*Штодзённа ўзімку,*
*штодзённа ўлетку...*

А ўжо вясной ды восенню, трэба разумець, і сам Бог загадаў!

Дрэнна, аднак, што загад яго не ўсе мужчыны пачулі. А таму на здымку (як лічыць спадарыня Чыгрынава з вёскі Забалацце Вілейскага раёна):

*Лізь у ручку, лізь у шчочку...*
*Ды не будзіць цёмнай ночкай.*
*І не курыць, і не п'е,*
*Ранкам тапкі падае.*
*Без капрызаў у ядзе*
*І не кідае ў бядзе...*
*Стала модным, модным дужа —*
*Мець сабачку замест мужа.*

Ёсць, да слова — хоць і не ў тэму — меркаванне (што цікава, зусім не жаночае — ад спадара Гарачова з Іўеўшчыны), у чым каранi вось гэтай моды, чаму так адбываецца? Ды таму, што

*Юнакі цяпер у нас*
*Дробныя і марныя:*
*Ані дзеўкам на паказ,*
*Ні для службы ў арміі.*

Тут, мусіць, варта зазначыць, што раней вось на гэта (на камплекцыю, знешнасць, на службу не службу) увагі меней звярталася. Бабулі-матулі нашы лічылі: «Не бяды, што худы, абы ішоў хоць куды. І пастаў абы-дзе, дык ніхто не ўкрадзе»... Сучасныя ж дзеўкі-маладзіцы насамі круцяць: перабіраюць, чакаюць, шукаюць, каб...

Стары анекдот. Адна маладзічка аб'яву ў «Звязду» падавала. Шукаю, маўляў, з самымі сур'ёзнымі намерамі маладога, высокага, разумнага, багатага, працавітага, адукаванага, без шкодных звычак... Аніхто не адгукнуўся. Праз год яшчэ раз пошукі ўсчала. З тымі ж намерамі... І такога ж маладога, высокага, разумнага, багатага... Зноў стала чакаць... А гады ішлі. Таму ў чарговай абвестцы яна напісала так: «Шукаю маладога, высокага, разумнага, добрага, багатага, працавітага, без шкодных звычак (і гэтак далей) — ну хоць паглядзець!».

Вось таму «шукальніцы» — куды ні глянь: хоць вакол сябе, хоць на экран тэлевізара — усё часцей ператвараюцца ў «разбуральніц» (чужых сем'яў) альбо паддаюцца той модзе, пра якую напісала спадарыня Чыгрынава: «замест мужа» заводзяць сабачак... Хоць у гэтых вось апошніх выпадках і могуць з'явіцца пытанні, адно з якіх сфармулявалі сужэнцы Астроўскія з Мінска:

*Мець сабачак — гэта шык,*
*Люба паглядзеці!*
*Ды, скажыце, дзе ж мужык?*
*Скуль узяцца дзецям?*



Што ж датычыцца такіх зменлівых павеваў моды, то пра яе ў сваім лісце разважае спадарыня Гудачкова з Жыткавічаў: «Глянуўшы на здымак, успомніла пару сваёй маладосці, калі і жук і жаба, як той казаў, хадзілі з транзістарнымі прыёмнікамі. Насілі іх хто дзе — хто ў руках, хто ў кішэнях. Так што часам і не хацеў бы, а слухаеш чужую музыку, чужыя навіны... Гэтую моду праграс адкінуў, увёў новую — на мабільнікі. Але ж яны таксама не вечныя?».

Такога ж меркавання прытрымліваюцца сужэнцы Астроўскія:

*Ужо мабільнік «не ў залік» —*
*Да яго любы прывык.*
*А сабакі — тут цікава:*
*Асабліва той, што справа.*

Трэба разумець, справа ад кабеты?..

Як і варта было чакаць, менавіта ён прыцягнуў увагу чытачоў, менавіта яму прысвечана большасць подпісаў-вершаў. Вось што піша, напрыклад, той самы спадар Гарачоў з Іўеўшчыны:

*Здымак мо камусь для смеху,*
*А каму — ўсё роўна...*
*Я ж убачыў: цырк паехаў —*
*Засталіся клоўны.*

Чаму засталіся? І канкрэтна вось гэты, «правы», дакладна ведае спадар Трайкоўскі з Мінска, бо пра «даму з сабачкам» ён піша прыкладна так:

*Вы з Жулькай выйшлі на прагулку.*
*Яго насустрач лёс пагнаў...*
*Ды зазірнуў у вашу сумку:*
*І ў той жа міг на лапкі стаў...*
*Але ж у цырк вы не званіце,*
*Не там ён хоча выступаць.*
*Яго дадому занясіце,*
*Бо грэх каханых разлучаць.*

Грэх і сапраўды. Але ж гэта — калі каханне ўзаемнае. А калі не? На здымку, як мяркуе спадарыня Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна, зусім не яно. А яго — узаемнага — нават быць не можа, бо

*Без машыны ты ніхто,*
*Калі «дзеўчына» ў «аўто»:*
*Не спявай, брат, серэнады —*
*Мінакі ім, бач, не рады...*

Яны (вы яшчэ раз глянулі на верхні здымак?) якраз наадварот (на думку спадара Гаўрыша з Чавусаў):

*Дэманструюць гонар свой,*
*На артыста — нуль увагі,*
*Хоць на задніх лапках стой,*
*Хоць яўляй узор адвагі.*

Крыўдна...

Тая ж думка, але іншымі словамі ў радках спадара Гарачова:

*Калі колерам ты белы,*
*Дык залазь у сумку смела*
*І дазволу не пытай.*
*А калі твой колер рыжы,*
*Як фанера над Парыжам,*
*Не маліся — пралятай.*

Што несправядліва! Што зусім недальнабачна, як лічыць Мікалай Валянцінавіч Старых з Гомеля, і таму робіць рыжаму свайго роду пратэкцыю:

*Вазьмі яго, цётка, з сабою,*
*Ён будзе ваш двор пільнаваць...*
*Не ганьба «малое-худое»:*
*Такія — майстры пабрахаць.*

І гэта, вядома ж, не ўсё, што могуць нашы гадаванцы. На думку спадара Гарачова:

*Ёсць у жонкі Куклачова*
*Асабістая ахова:*
*Паспрабуй ты іх пакратай —*
*Атрымаеш левай лапай.*

Больш за тое — ці не пра галоўную здольнасць братоў нашых меншых (шукаць, браць след... У тым ліку і мужаў) піша спадарыня Гудачкова:

*Не схаваешся ад жонкі*
*Ні ў сяброў, ні ў маладзёнкі,*
*Ні ў піўнушцы з ракамі —*
*Знойдзе, бо... з сабакамі.*

А таму (і з таго ж канверта):

*Ці пагода, ці нягода,*
*А пануе ў свеце мода.*
*І заўсёды будзе так:*
*Выйдзе мода на мабільнік,*
*Ды не выйдзе на сабак!*

Аднак памылкай было б думаць, што на гэтым здымку нашы чытачы ўбачылі толькі тое, што ляжыць на паверхні. Асобныя «капнулі» глыбей, «рассунулі» рамкі кадра. А там — сучасныя балючыя праблемы. Ну, па-першае:

*У наяўнасці карціна,*
*Як няроўна дзеліць бог:*
*Мусю носяць у карзіне,*
*Пуся — скача каля ног, —*

піша спадарыня Бурко з вёскі Капланцы Бярэзінскага раёна. І нават тлумачыць, адкуль такая несправядлівасць у адносінах да правага (ад гаспадыні) сабачкі:

*Ты «гаў-гаў» сваё разнёс?*
*І... спагады просіш?*
*І чакаеш, што цябе*
*На руках паносяць?*
*Гаспадыня дасць адказ,*
*Рэзне матку-праўду,*
*Што дваіх — замнога вас:*
*Скарачаю «кадры».*

Гэтыя працэсы з «кадрамі» цяпер шмат дзе праходзяць. І як жа балюча... Яшчэ і ад таго (радкі спадара Гарачова), што

*Час не грэе і не лечыць,*
*Ён прыносіць змены:*
*Сёння зноўку сучкі брэшуць,*
*А кусаюць цэны.*

Вось на іх бы сабак...

А што — гэта ідэя (і з таго ж канверта):

*Здавён мы клалі ў кашалькі*
*Запас грашовых знакаў:*
*Ляжалі там «зубры», «ваўкі»,*
*Ды не было ж «сабакаў».*

А калі займець? І нацкаваць — на цэны...

Як казала любімая жанкамі Скарлет О'Хара, мы падумаем пра гэта заўтра. Сёння — самы час, па-першае, падзякаваць усім, хто даслаў свае варыянты подпісаў да чарговага здымка, па-другое, папрасіць прабачэння ў тых, чые радкі засталіся ненадрукаванымі. І, вядома ж, падвесці вынікі папярэдняга этапу (тады, нагадаем, на здымку быў мужчына, які вадой са шланга мыў ногі коніку)...

Найлепшыя радкі пра гэтую «салодкую парачку», паводле меркавання вялікага чытацкага журы, напісалі сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадарыні Кусянкова з Рагачоўскага раёна і Янучок з Клецкага, спадары Тычко з Мёршчыны, Дубовік з Бярэзіншчыны, Гарачоў з Іўеўшчыны. Але ж найбольш галасоў (пераважна жаночых) набраў подпіс мінчанкі Алы Тарасік:

*Гэты хлопча жонку меў...*
*Жыць па-людску — не хацеў.*
*Вось яна з таго дурдому*
*І паехала к другому.*
*...Як не мыеш ножкі мілцы,*
*Мый, браток, сваёй кабылцы.*

Такім чынам, галоўны прыз у выглядзе падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал 2013 года застаецца ў Мінску, другі — падпіска (на месяц) на часопіс «Вожык» — накіроўваецца ў вёску Лучын Рагачоўскага раёна да спадарыні Кусянковай.

Хочаце, каб да вас? Тады ўважліва паглядзіце на новы конкурсны здымак, прыдумайце свой (альбо свае) варыянты подпісаў, сем (як мінімум) разоў перачытайце, каб пераканацца, што прыгажэй, разумней, дасціпней ужо не напішаш, і дашліце ў рэдакцыю. Прапановы прымаюцца, конкурс працягваецца.

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота (яно ж новае конкурснае заданне) Анатоля КЛЕШЧУКА** ■

## МІРСКІ ЗАМАК: ТУРЫСТАЎ ШМАТ ЯК НІКОЛІ

**Сёлета ў музеі «Замкавы комплекс «Мір» пабывала рэкордная колькасць турыстаў. Толькі са студзеня па жнівень яго наведала 190 тысяч чалавек. Гэта на 55 тысяч больш, чым летась.**

Такі істотны рост цікавасці наведвальнікаў да аднаго з самых вядомых і папулярных турыстычных брэндаў нашай краіны выклікана ўменнем прыцягнуць да яго ўвагу. Немалую ролю ў гэтым адыграла арганізацыя тэматычных выстаў. У гэтым сезоне пад дахам замка было прадстаўлена 20 арыгінальных экспазіцый: нечаканыя артэфакты, цікавыя калекцыі. За 7 месяцаў праведзена больш за 4,5 тысячы экскурсій, яшчэ каля 6,5 тысячы чалавек скарысталіся навінкай — паслугамі электроннага аўдыягіда, які вядзе экскурсію на роднай мове госця.

Прыкмета гэтага сезона — значны рост колькасці турыстаў з блізкага і далёкага замежжа: Польшчы, Літвы, Расіі, Францыі, Галандыі, Іспаніі, Кітая, Бразіліі. Увогуле доля замежных гасцей сярод наведвальнікаў замкавага комплексу «Мір» складае каля 40 працэнтаў. Супрацоўнікі музея, зыходзячы з уласных назіранняў, склалі свой рэйтынг папулярнасці пастаянных экспазіцый сярод экскурсантаў. На першым месцы «Сталовая хата» — асноўнае параднае памяшканне палаца эпохі Рэнесансу. Зала была рэканструявана ў адпаведнасці з архіўнымі дакументамі і крыніцамі канца XVI — сярэдзіны XVII стагоддзяў. На другім месцы па папулярнасці — «Партрэтная зала», якая раней выконвала парадна-прадстаўнічыя функцыі. Партрэты продкаў і саміх уладальнікаў замка адлюстроўвалі гісторыю сям'і «ў асобах», сведчылі аб старажытнасці роду Радзівілаў. На трэцім месцы — пакоі князя Міхася Святаполк-Мірскага, апошняга ўладальніка замка: бібліятэка, кабінет і гасцёўня.



**Леанід ТУГАРЫН.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ на право заключения договора аренды земельного участка

| Наименование объекта | Лот № 1 |
|---|---|
| Целевое назначение | Строительство и обслуживание базы отдыха |
| Местонахождение объекта | северо-восточнее агрогородка Луково Малоритского района |
| Продавец объекта | Малоритский районный исполнительный комитет |
| Организатор торгов | Малоритский районный исполнительный комитет |
| Начальная цена продажи, руб. | 250 752 |
| Сумма задатка, руб. | 50 150 |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер | 0,3962 га, Решение Брестского облисполкома от 18.09.2012 № 724, Кад. № 125281300001000015 |
| Ограничения в использовании земельного участка | Водоохранная зона озера Луковское на площади 0,2250 га, в прибрежной полосе озера Луковское на площади 0,1712 га |
| Вещное право, срок аренды земельного участка | Аренда 50 лет |
| Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, руб. | 7 268 320 |
| Условия продажи | 1. Внесение платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>2. возмещение затрат, вязанных с организацией и проведением аукциона;<br>3. возмещение убытков государственному лесохозяйственному учреждению «Малоритский лесхоз» в сумме 3 038 350 (три миллиона тридцать восемь тысяч триста пятьдесят) рублей;<br>4. перечисление на транзитный счет, открытый главному управлению Министерства финансов Республики Беларусь по месту постановки на учет предприятия, денежных средств в сумме 6 862 580 (шесть миллионов восемьсот шестьдесят две тысячи пятьсот восемьдесят) рублей на возмещение потерь лесохозяйственного производства, вызванных изъятием лесных земель для использования их в целях, не связанных с ведением лесного хозяйства;<br>5. заключение с Малоритским райисполкомом в установленном порядке договора аренды земельного участка и осуществление государственной регистрации права на земельный участок в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка;<br>6. получение в установленном порядке разрешения Малоритского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проектную документацию на строительство базы отдыха;<br>7. приступить к использованию земельного участка не позднее шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта;<br>8. осуществление строительства объекта в срок, определенный проектной документацией. |

Аукцион состоится **21 ноября 2012 года в 11.30** по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1.

**Контактные телефоны в г. Малорита: (8 01651) 2 30 01, 2 30 17, 2 28 03.**

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет № 3602223000219 ЦБУ № 120 АСБ «Беларусбанк» МФО 150501246, код платежа 04002, получатель платежа – районный бюджет, УНН 200077623.

3. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

4. Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников.

**– для аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства жилого дома.*

**Заявления об участии в аукционе принимаются до 15 ноября 2012 года (включительно) по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 54, землеустроительная служба Малоритского райисполкома с 8.00 до 17.00 по рабочим дням.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже недвижимого имущества, находящегося в республиканской собственности

Организатор аукциона:
**фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел.: (8017) 228-60-13, 224-39-76, 500-47-10**
Место проведения аукциона:
**г. Минск, ул. Чкалова, 5**
Дата и время проведения аукциона:
**12 ноября 2012 г. в 11.00**

**Лот № 1**

**Недвижимое имущество** и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 612/С-870) – одноэтажное **здание хранилища для цветов** общей площадью 392,9 кв.м, 1980 года постройки, фундамент ленточный, железобетонный, стены и перегородки кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Принадлежности: асфальтовое покрытие (1810 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 0,5361 га по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Труда, д. 2, назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания хранилища для цветов. Земельный участок предоставляется в аренду сроком до 12 августа 2037 г. Введены ограничения в использовании части земельного участка площадью 0,1199 га в связи с нахождением в охранной зоне сетей и сооружений канализации. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов административного назначения, объектов производственного назначения, которые не являются источниками вредных веществ, шума и вибрации. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо: в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона осуществить государственную регистрацию возникновения прав, ограничений (обременений) на земельный участок; получить в установленном порядке разрешение Жодинского городского исполнительного комитета, архитектурно-планировочное задание и заключения (технические условия) заинтересованных служб на проектирование и реконструкцию (строительство) объекта; осуществить реконструкцию (строительство) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; произвести благоустройство прилегающей территории и строительство внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно разработанной и утвержденной проектной документации. Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется Жодинским городским исполнительным комитетом по заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона, которое подается не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обеспечить беспрепятственный подъезд и проход по своей территории к земельному участку, формируемому для обслуживания здания склада (инв. № 612/С-873).

**Начальная цена предмета аукциона: 314 931 121** рубль (в т.ч. объект – 168 658 671 рубль, право заключения договора аренды земельного участка – 146 272 450 рублей). *Начальная цена продажи объекта понижена на 50%.* **Размер задатка: 60 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 168 007 рублей (с НДС 20 %).

**Продавец:** Минское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Минскэнерго» (г. Минск, ул. Аранская, 24, тел. (8017) 2184297, 2238103, 2272111). **Арендодатель земельного участка:** Жодинский городской исполнительный комитет (Минская обл., г. Жодино, ул. 40 лет Октября, 7, тел. (801775) 32733).

**Лот № 2**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 630/С-61798) **–** одноэтажное **здание конюшни** общей площадью 83,8 кв.м, 1977 года постройки, фундамент бетонный, стены и перегородки шлакобетонные, чердачное перекрытие деревянное, крыша шиферная. Принадлежности: дощатый сарай (25 кв.м). Объект расположен на земельном участке площадью 0,0200 га по адресу: Минская обл., Молодечненский район, дер. Раевка, ул. Луговая, д.4а, назначение: земельный участок для строительства и обслуживания здания конюшни. Введены ограничения в использовании земельного участка в связи с его нахождением в водоохранной зоне реки Рыбчанка вне прибрежной полосы. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 20 лет. **Условия использования земельного участка:** разрешено использовать земельный участок для размещения объектов промышленности, размещение которых допускается в зоне жилой застройки, объектов бытового обслуживания населения. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды необходимо осуществить государственную регистрацию прекращения и возникновения прав на земельный участок.

**Начальная цена предмета аукциона: 2 418 265** рублей. **Размер задатка: 400 000** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 80 %.*

**Продавец:** республиканское унитарное производственное предприятие «Новосверженский лесозавод» (Минская обл., Столбцовский район, дер. Новый Свержень, ул. Железнодорожная, 8, тел. (801717) 46683, 46400). **Арендодатель земельного участка:** Молодечненский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, 6, тел. (80176) 771663).

**Лот № 3**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 622/С-38420) – одноэтажное **здание погрузочно-разгрузочной рампы** общей площадью 632,6 кв.м, 1963 года постройки, фундамент бутовый, стены кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1975 га по адресу: Минская обл., Столбцовский район, п. Новоколосово, назначение: земельный участок для обслуживания зданий и сооружений (погрузочно-разгрузочная рампа) в п. Новоколосово. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 20 лет. **Условия использования земельного участка:** разрешено в установленном законодательством порядке изменять целевое назначение земельного участка в случае изменения целевого назначения недвижимого имущества и использовать его для обслуживания здания специализированного иного назначения, здания специализированного склада, базы материально-технического снабжения, размещение которых допускается в общественной и промышленной зоне. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: в двухмесячный срок со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок; получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта, иной проектной документации.

**Начальная цена предмета аукциона: 235 565 285** рублей. **Размер задатка: 45 000 000** рублей.

**Продавец:** государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Брестская обл., г. Барановичи, ул. Димитрова, 42, тел. (801634) 57102). **Арендодатель земельного участка:** Столбцовский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Столбцы, ул. Ленинская, 45, тел. (801717) 55365).

**Лот № 4**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 601/С-8095) – двухэтажное **здание учебного класса № 4/111** общей площадью 1711,3 кв.м, 1973 года постройки, фундамент – фундаментные блоки, стены блочные, перегородки кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1158 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания учебного класса № 4/111. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 50 лет со дня государственной регистрации права аренды земельного участка в территориальной организации по государственной регистрации. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

**Начальная цена предмета аукциона: 392 156 629** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 20 %.* **Размер задатка: 70 000 000** рублей.

**лот № 5**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 601/С-8061) – двухэтажное **здание казармы под учебный класс № 4/2** общей площадью 1635,7 кв.м, 1937 года постройки, фундамент – бутобетон, стены и перегородки кирпичные, перекрытия (чердачные и междуэтажные) деревянные оштукатуренные, крыша шиферная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,1106 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы № 4/2. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 50 лет со дня государственной регистрации права аренды земельного участка в территориальной организации по государственной регистрации. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации, административного назначения, складских помещений.

**Начальная цена предмета аукциона: 332 258 882** рубля. *Начальная цена продажи объекта понижена на 20 %.* **Размер задатка: 60 000 000** рублей.

**Лот № 6**

**Недвижимое имущество: капитальное строение** (инв. № 601/С-8087) – двухэтажное **здание казармы 4/3** общей площадью 1099,6 кв.м, 1938 года постройки, фундамент бетонный, стены кирпичные, перегородки кирпичные, дощатые оштукатуренные, перекрытия (чердачное и междуэтажное) – деревянные, оштукатуренные, крыша шиферная, имеется бетонное крыльцо. Объект расположен на земельном участке площадью 0,0784 га по адресу: Минская обл., Логойский район, г.п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания здания казармы № 4/3. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 45 лет со дня государственной регистрации права аренды земельного участка в территориальной организации по государственной регистрации. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного назначения, которые не являются источником вредных веществ, шума и вибрации.

**Начальная цена предмета аукциона: 261 108 810** рублей. *Начальная цена продажи объекта понижена на 20 %.* **Размер задатка: 50 000 000** рублей.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона **(по Лотам №№ 4-6)** необходимо в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды обратиться за государственной регистрацией возникновения прав на земельный участок.

**Продавец (Лоты №№ 4–6):** государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Минская обл., г. Борисов, ул. Л. Чаловской, 26, тел. (80177) 757659, 733349). **Арендодатель земельных участков (Лоты № 4–6):** Логойский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Логойск, ул. Советская, 15, тел. (801774) 55141).

**Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 8 ноября 2012 г.** включительно на текущий (расчетный) счет № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». **Назначение платежа:** ***задаток для участия в аукционе.*** Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

**Заявления на участие в аукционе** с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 310, 312. Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **8 ноября 2012 г. до 12.00.**

Информация о предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности» и Указа Президента Республики Беларусь от 4 июля 2012 г. № 294 «О порядке распоряжения государственным имуществом».

Земельный участок (**по Лотам №№ 2–6**) предоставляется победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договоров аренды.

Для участия в аукционе в указанные в извещении сроки необходимо подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан:

1. подписать протокол о результатах аукциона; 2. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения соответствующими исполнительными комитетами) за право заключения договора аренды земельного участка (в случае приобретения капитального строения инв. № 612/С-870); возместить затраты на организацию и проведение аукциона; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка; 3. после совершения названных действий и представления организатору аукциона, продавцу, и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества может быть предоставлена в соответствии с действующим законодательством.

# Краіна здароўя

Выпуск № 6 (300)

■ Здароўе нацыі

# ПА КЕЛІХУ — ПА ПЕЧАНІ...

**Печань выконвае ў нашым арганізме столькі розных работ, што і не дзіўна, жартам кажучы, чаму яна такая вялікая. Гэты орган ажыццяўляе фактычна ўсе віды абменных працэсаў. Бялковы, вугляводны, тлушчавы, мінеральны, вітамінны, гарманальны, пігментны... Печань «курыруе» нават згусальнасць крыві. Нарэшце, менавіта гэты орган займаецца таксічнымі рэчывамі — «бярэ на сябе» цяжкія металы, абясшкоджвае любую атруту, у тым ліку грыбны яд, алкаголь (а дакладней, этанол).**

**Праўда, забеспячэнне кожнай дэзінтаксікацыі не праходзіць бясследна. Проста пры малых дозах печань «ахвяруе» пэўную частку клетак, а пры надта вялікіх... гіне. Фактычна ў печані толькі два асноўныя ворагі — алкаголь і вірусы. Паколькі цалкам выдаліць алкаголь з нашага жыцця немагчыма, Сусветная арганізацыя аховы здароўя вынайшла кампраміс і вызначыла аптымальныя дозы ўжывання этанолу. Гэта 40-60 мг этылавага спірту (120 мг гарэлкі) у дзень для мужчын і 20-30 мг — для жанчын. Перавышэнне гэтых аб'ёмаў абавязкова адбіваецца на печані. Прынцыповым з'яўляецца не разнавіднасць напою, а колькасць спірту ў ім. І віно, і піва змяшчаюць этанол, а таму таксама небяспечныя. Дарэчы, гастраэнтэролагі сцвярджаюць, што ў апошнія гады пачасціліся выпадкі менавіта піўнога пашкоджання печані. Яно развіваецца ў выніку штодзённага ўжывання звыш 2 л напою. Рэкамендуе СААЗ пакідаць і «светлыя дні» на тыдні, падчас якіх не варта ўжываць алкаголь нават у так званых бяспечных дозах.**

## Прынцыповыя ворагі

Цікава, што літаральна толькі ў 60-я гады мінулага стагоддзя была ўстаноўлена разбуральная роля алкаголю для печані. Цяпер дакладна вядома, што пад уздзеяннем спірту ў печані ўтвараюцца такое таксічнае рэчыва, як алкагольная дэгідрагіназа, і так званы алкагольны гіялін — бялок, які прыводзіць да адмірання «добрых» пячоначных клетак і замяшчэння іх «дрэннымі». Коратка кажучы, развіваецца алкагольны гепатыт, а затым і цыроз.

Да цырозу здольны прывесці і вірусныя гепатыты B, C, D (тыпы F і G на сёння сустракаюцца надзвычай рэдка). Перадаюцца вірусы з крывёй або палавым шляхам. Толькі гепатыт A перадаецца з бруднай ежай і вадой і, як вядома, добра лечыцца, не даючы хранічнага працэсу. Ад гепатыту B цяпер вакцынуюць у дзіцячым узросце. Ад гепатыту C, на жаль, прышчапіцца нельга. Вылучаецца ён і сваёй здольнасцю прыводзіць да цырозу фактычна незаўважна для гаспадара, за што і атрымаў назву «пяшчотнага забойцы». Вірусамі гепатытаў B і C інфіцыяваны зараз кожны 14-ы жыхар на планеце. Добра хіба тое, што чалавек можа быць носьбітам віруса, але не хварэць — да таго часу, пакуль не падвядзе імунітэт.

— Гепатыт азначае гібель часткі пячоначных клетак, — тлумачыць **дацэнт 2-й кафедры ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, урач-гастраэнтэролаг вышэйшай катэгорыі Мікалай КАПРАЛАЎ**. — Аднавіць іх нельга, паколькі на месцы гібелі здаровых клетак утвараецца грубая, змярцвелая тканка. Разам з тым, мы можам спыніць размнажэнне віруса, не даць яму шанцаў паўторна атакаваць клеткі печані, паколькі гэты працэс набліжае хворага да цырозу. А што такое цыроз? Гэта адсутнасць для печані магчымасці выконваць свае шматлікія функцыі. Дарэчы, той жа гепатыт C здольны прыводзіць і да развіцця раку печані...

Да гепатыту могуць прыводзіць і некаторыя іншыя прычыны — атлусценне, цукровы дыябет, шэраг медыкаментозных прэпаратаў. Трэба разумець, што **пры атлусценні тлушч адкладваецца не толькі «на таліі», але і ў клетках печані, што аднойчы блакіруе яе асноўныя функцыі і выклікае гепатыт. Вядомыя на сёння і каля 200 лекаў, якія могуць пашкоджваць печань. І справа не толькі ў працяглым, бескантрольным прыёме апошніх. Некаторыя з нас з'яўляюцца закладнікамі павышанай адчувальнасці да таго ці іншага антыбіётыку, сульфаніламіднага, супрацьтуберкулёзнага, гарманальнага прэпарату, парацэтамолу, міядарону і г.д.**

## Дык нічога ж не балела!

Асноўныя клінікі краіны маюць неабходнае абсталяванне для правядзення дыягностыкі паталогіі печані. Прымяняцца могуць лабараторныя біяхімічныя тэсты, агульнаклінічныя лабараторныя і імуналагічныя даследаванні, ультрагук і камп'ютарная тамаграфія, радыеізатопнае сканаванне, біяпсія. У выпадках алкагольнага гепатыту або цырозу гэтыя даследаванні праводзяцца, як правіла, ужо на досыць позніх стадыях.

Самай першай праявай пры такіх станах з'яўляецца павелічэнне печані, аднак яна амаль ніяк не заяўляе свайму гаспадару аб такой змене. Болю як такога няма. Тым часам у пячоначнай тканцы, зноў жа бессімптомна, назапашваецца тлушч, які блакіруе работу пячоначных клетак і падводзіць да фарміравання непасрэдна гепатыту. І нават гэты этап хваробы можа прайсці незаўважна для пацыента, які працягвае злоўжываць алкаголем.

У шэрагу выпадкаў хворыя з алкагольным пашкоджаннем печані трапляюць да ўрача толькі ў стадыі цырозу, калі парушыліся ўсе асноўныя абменныя працэсы, назіраецца страта вагі і мышачнай тканкі, на целе з'явіліся кровападцёкі, жанчыны пазбавіліся менструальнага цыклу, а ў мужчын развілася імпатэнцыя і бясплоднасць. Хворы стаў, як кажуць урачы, малаперспектыўным у лячэнні.

**Вірусны гепатыт «прапусціць» цяжэй. Траплянне віруса ў арганізм літаральна ў першыя дні, як правіла, выклікае вострую рэакцыю, з досыць выражанымі клінічнымі праявамі.** У апошнія гады для лячэння такіх хворых прымяняюць моцныя антывірусныя прэпараты. Лячэнне працяглае і нятаннае — у вострай стадыі праводзіцца на базе інфекцыйных бальніц, хранічнымі ж пацыентамі займаюцца тэрапеўты і гастраэнтэролагі.

## Класічныя пацыенты

— Можна смела сцвярджаць, што за адно дзесяцігоддзе колькасць хворых з гепатытамі і цырозамі прырастае ў сярэднім у два разы, — кажа Мікалай Валянцінавіч. — Нашы аддзяленні зараз перапоўненыя, а на пачатку 90-х у аддзяленні гастраэнтэралогіі цяжка было сустрэць пацыента з алкагольным цырозам. Мы не маглі паказаць студэнтам такога хворага...

Цімафею Аляксандравічу — 51 год. Мае рабочую спецыяльнасць. Паступіў у 9-ю гарадскую клінічную бальніцу г. Мінска ўпершыню. Дыягназ — цыроз печані алкагольнага паходжання, сіндром партальнай гіпертэнзіі (павелічэнне вен стрававода), асцыт (вадзянка жывата) — у брушной поласці знаходзіцца каля 15 л вадкасці, хранічны панкрэатыт, анемія сярэдняй ступені цяжару... Працаздольнасць адназначна страчана. Пацыента накіроўваюць на інваліднасць. Прагноз — несуцяшальны. Як высветлілася, хворы на працягу сямі гадоў рэгулярна злоўжываў алкагольнымі напоямі. Гэта і прывяло да сур'ёзнага пашкоджання печані — спачатку там развілася змярцвенне тканкі, потым буйныя вены, якія праходзяць праз печань, аказаліся перацiснутымі, у выніку чаго сфарміраваўся сіндром партальнай гіпертэнзіі. Пры гэтым стане асабліва церпяць і моцна пашыраюцца вены стрававода. Урэшце такі пацыент гіне ад разрыву страваводнай вены.

Другі хворы, 47-гадовы дырэктар прыватнай установы, паступіў у стацыянар з жаўтухай і павялічанай печанню. Мужчына каля сямі гадоў злоўжываў алкаголем, што пацвярджаюць і сваякі. Хвораму зрабілі радыеізатопнае даследаванне, якое паказала пашкоджанне часткі пячоначных клетак: радыеізатоп назапасіўся не ў здаровай печані, а ў селязёнцы...

